ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ



РАЙНЭР МАРЫЯ РЫЛЬКЕ

САНЕТЫ АРФЕЮ

ПАЭЗІЯ НАРОДАЎ СВЕТУ



Райнэр Марыя Рыльке, 1925 г.

РАЙНЭР МАРЫЯ РЫЛЬКЕ

САНЕТЫ АРФЕЮ

ЛІРЫКА

Выбраў і пераклаў з нямецкай мовы
ВАСІЛЬ СЁМУХА

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1982

И (Австр)
Р 95

Пераклад зроблены з выдання:
Rainer Maria Rilke
Werke in drei Bänden. Erster Band —
Zweiter Band. Gedichte
Insel-Verlag Anton Kippenberg, Leipzig, 1978

Рэцэнзент Уладзімір Папковіч

Р $\frac{4703000000-094}{М\ 302(05)-82}$ 162—82

© Укладанне. Прадмова. Заўвагі. Афармленне. Пераклад на беларускую мову. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1982 г.

ПАКУТЫ І НАДЗЕІ ПАЭТА

Сярод паэтаў Захаду, якія выступілі са сваімі творамі на мяжы XIX—XX стагоддзяў, адно з першых месц займае выдатны аўстрыйскі лірык Райнэр Марыя Рыльке. Паэзія Рыльке вырасла на аснове ўнутранага засваення гуманістычных каштоўнасцей іншых культур — славянскіх і раманскіх. Шырокую канцэпцыю класічнай і сучаснай еўрапейскай культуры паэт супрацьпастаўляў нацыяналістычнай і шавіністычнай канцэпцыі тагачаснай Аўстра-Венгерскай манархіі.

Рыльке нарадзіўся 4 снежня 1875 года ў Празе, дзе прайшлі яго дзяцінства і дні юнацтва. Яго продкі былі чэхі. У адзінаццаць год будучага паэта бацькі аддалі ў кадэцкі корпус. Хваравіты і ўражлівы падлетак адчуваў сябе тут, як у турме. Хутка яго адлічылі за непаспяховасць і слабае здароўе. Але Рыльке настойліва вучыцца — наведвае Пражскі, а потым Берлінскі і Мюнхенскі універсітэты. Гэта дало яму магчымасць набыць грунтоўныя веды ў галіне мастацтва, літаратуры і моў.

Свае першыя вершы Рыльке напісаў у дзіцячыя гады. Яго паэтычным дэбютам быў зборнік «Жыццё і песні» (1894). Потым выходзяць зборнікі «Ахвяры ларам» (1895) і «Увянчаны марамі» (1896). У іх адчуваецца цесная сувязь паэта з жыццём чэшскага народа, з нацыянальнай паэтычнай традыцыяй. Акрэсліваецца сацыяльная і гуманістычная накіраванасць паэзіі Рыльке, якая будзе ўзмацняцца з кожнай новай кнігай паэта.

Праўда, Рыльке быў супраць, каб у яго паэзіі шукалі сацыяльнасць. Ён хацеў, каб яго творы разглядвалі толькі ў этычным або эстэтычным плане. І ўсё ж

скрозь самыя адцягненыя этычныя і метафізічныя пабудаванні ў паэзіі Рыльке выразна прагледжваецца сацыяльны пачатак.

Рыльке з'яўляецца аўтарам дзесяці паэтычных зборнікаў (лепшыя з якіх, хоць і не адразу, прынеслі яму сусветную вядомасць), шэрагу празаічных твораў, у тым ліку рамана «Запіскі Мальтэ Лаўрыдса Брыге», грунтоўнай манаграфіі пра Радэна, пранікнёных «Пісьмаў пра Сезана», перакладаў прозы і паэзіі.

Лёс Рыльке склаўся нялёгка. Неўладкаванае жыццё, поўнае матэрыяльных нягод і сямейных непаладкаў, прымусіла яго пакінуць зямлю продкаў і, падобна Байрану, Гейнэ, Міцкевічу, вандраваць па розных краінах Еўропы. Але не толькі беднасць гнала Рыльке з горада ў горад, з краіны ў краіну. Хваравітае адчуванне адзіноты, імкненне вырвацца з удушлівай атмасферы аўстрыйскага мадэрнізму, надзея знайсці «сапраўднае аблічча свету» былі галоўнай прычынай гэтага.

Духоўнай радзімаю Рыльке стала Расія, у якой ён пабываў у 1899 і 1900 гадах. Двойчы Рыльке наведваў Л. Талстога ў Яснай Паляне, ездзіў у Маскву і Пецярбург, падарожнічаў па Волзе і Украіне, жыў у сялянскага паэта С. Д. Дрожжына. Рыльке вельмі захапіўся старажытным рускім дойлідствам, сучасным яму рускім жывапісам і, асабліва, рускай моваю. Ён пераклаў на нямецкую мову «Слова аб палку Ігаравым», паасобныя творы М. Лермантава, А. Чэхава, Ф. Дастаеўскага і нават сам пісаў вершы па-руску.

Рыльке ўспрыняў Расію крыху аднабакова — у святле славянафільскіх і рэлігійных уяўленняў. Яна бачылася яму як краіна будучыні, але як антыпод заходняй цывілізацыі з яе механіцызмам, практыцызмам, уласніцкім эгаізмам. Пасля наведання Расіі ў Рыльке ўзмацняецца адчуванне ўнутранай сувязі паміж людзьмі. «Калі б мая душа была горадам, яна была б Ма-

сквою»,— пісаў ён. «Чым я абавязаны Расіі? Яна зрабіла з мяне таго, кім я стаў; з яе я ўнутрана выйшаў, усе мае глыбінныя вытокі — там» (пісьмо 1920 г.).

Балючым было вяртанне Рыльке ў капіталістычную Еўропу. Уражанні паэта знайшлі месца ў кнізе вершаў «Часаслоў» (1905) — своеасаблівым водгуку Рыльке аб Расіі.

Кніга напісана ў форме споведзі-гутаркі з «суседам-богам» рускага манаха, усё жыццё якога ёсць нясыннае імкненне наблізіцца да бога. Гэтае імкненне — пошукі найвышэйшага, вечнага сэнсу жыцця. Бог Рыльке — не хрысціянскі бог і наогул не бог якой-небудзь канкрэтнай рэлігіі. Іншы раз ён з'яўляецца ў абліччы простага селяніна, старога барадатага мужыка. Манах на роўных трымаецца з богам («Ты мне сусед, божа!»). Бог памагае яму, адзінокаму і замкнёнаму чалавеку, пераадолець адчужанасць, адчуць з'яднанасць з людзьмі. Праз умоўную, рэлігійную абалонку прабіваецца жывое чалавечае пачуццё, палымянае жаданне сацыяльнага абнаўлення.

У «Кнізе галечы і смерці» пачуццё жалю да чалавека перарастае ў гнеўны пратэст супраць буржуазнага ладу. Вобразы вялікіх капіталістычных гарадоў, гарадоў-«спрутаў», якіх нямала пабачыў паэт-вандроўнік, набываюць выключна трагічную афарбоўку.

Паэзія Рыльке прасякнута глыбокім трагічным непакоем. Гэта трагізм мастака, які адчувае варожасць капіталістычнага ладу ўсяму добраму, чыстаму і светламу, што ёсць у чалавеку, які ўсведамляе немагчымасць жыць у свеце несправядлівасці і зла, які марыць пра цэльнасць і гармонію чалавечага існавання і ў той жа час не бачыць рэальных шляхоў спраўджання свайго ідэалу.

Але калі героі Рыльке гінуць, як загінуў, напрыклад, герой яго рамана мастак Мальтэ Лаўрыдс Брыге,

дык аўтар павінен быў выжыць, павінен быў знайсці пункт апоры, адшукаць нейкія больш-менш устойлівыя духоўныя каштоўнасці, якія маглі супрацьстаяць жорсткай і бесчалавечнай цывілізацыі.

І Рыльке шукаў выйсця, шукаў упарта і настойліва, імкнучыся стварыць у паэзіі іншую рэальнасць, больш сапраўдную і асэнсаваную, як яму здавалася, чым штодзённая буржуазная рэчаіснасць. Як пратэст супраць жорсткасці і бесчалавечнасці капіталістычнага ладу ўзнікае патрабаванне інтэнсіўнага ўнутранага жыцця — жыцця ў творчасці, паэзіі, прыгажосці, патрабаванне духоўнага і эмацыянальнага абнаўлення чалавека і чалавецтва. Кожным радком Рыльке імкнецца напомніць людзям пра тое, што яны жывуць у адным бясконцым сусвеце. Ён імкнуўся вярнуць людзям страчаную разам з дзяцінствам свежасць пагляду, калі свет уяўляецца як адзінае цэлае, калі ў малым бачыцца бясконцае, калі спакой і нерухомасць воднай гладзі калышуць таямніцу неба, далёкіх зорных светаў.

Згубленасці і пакінутасці чалавека ў рэальным свеце супрацьстаўляецца пантэістычна-гуманістычнае сцверджанне цяснейшай узаемасувязі чалавека з другімі людзьмі і рэчамі, з прыродай, з космасам. Сэнс паэзіі Рыльке — у паэтычным адкрыцці грандыёзнага ў сваёй шматграннасці свету. Усеагульная сувязь, уключэнне ў сферу паэзіі звычайных рэчаў і падзей — аснова непаўторнай паэтычнай своеасаблівасці яго лірыкі.

Паэзія Рыльке аснавана на сузіранні. Але яно ў яго не пасіўнае і пакорлівае, а дапытлівае, шукальнае, поўнае філасофскага роздуму.

Новы этап у жыцці і творчасці Рыльке звязаны з яго жыццём у Францыі (1902—1911). Пад уплывам французскай паэтычнай культуры і выяўленчага мастацтва (асабліва Радэна, сябрам і асабістым сакрата-

ром якога ён быў) Рыльке пачынае аддаваць больш увагі дакладнаму, пластычнаму паказу рэчаў, з'яў і працэсаў жыцця і наогул фармальнай закончанасці верша.

Найлепшыя зборнікі Рыльке гэтага перыяду — «Кніга вобразаў» (1902, 1906), «Новыя вершы» (1907), «Новых вершаў другая частка» (1908). Яны вызначаюцца інтэлектуальнай напружанасцю ў спалучэнні з глыбокім лірызмам. Ім характэрны шырокі дыяпазон паказу рэчаіснасці (тут вершы пра каханне, прыроду, уражанні ад падарожжаў, ад твораў мастацтва, якія ўвасабляюць хараство і мудрасць жыцця). У вершах Рыльке паэтызуюцца гарады, саборы, статуі, кветкі, жывёлы («Архаічны торс Апалона», «Іспанская танцоўшчыца», «Рымскія фантаны», «Песня кахання», «Ваза з ружамі», «Пантэра», «Фламінга»). Імкненне да пластычнасці і рэльефнасці збліжаюць паэзію Рыльке з жывапісам і скульптурай.

Першая сусветная вайна ашаламіла Рыльке. Ён успрыняў яе як катастрофу, як заканамерны вынік крызісу заходняй цывілізацыі. Рыльке адчуваў, што чалавецтва стаіць на парозе велізарных зрухаў і змен. Ён марыў пра буру, на крылах якой «паэт можа разгарнуцца падобна сцягу». І таму Рыльке з энтузіязмам пісаў пра рэвалюцыю ў Германіі, сведкам якой ён быў, з цікавасцю сачыў за падзеямі, якія адбываліся ў любімай ім Расіі. Паэт верыў у бязмежнасць закладзеных у чалавеку творчых магчымасцей, у «незвычайнасць» і «небываласць» росквіту яго сіл і розуму. Вайна прымусіла Рыльке змоўкнуць — і, здавалася, назаўсёды. І ўсё ж яго паэтычная муза знайшла сілу для апошняга ўзлёту. У 1923 годзе, пасля доўгага перапынку, Рыльке публікуе свае славутыя лірыка-філасофскія цыклы — «Дуінскія элегіі» і «Санеты Арфею».

Яшчэ ў перадваенныя гады Рыльке пасля пакут-

лівых пошукаў прыходзіць да новага, вельмі своеасаблівага паэтычнага стылю. Адраджаючы традыцыі нямецкай класічнай паэзіі, ён звяртаецца да жанру філасофскай лірыкі. Толькі тут, у апошніх творах паэта, адчуваецца непасрэдны ўплыў нямецкай паэтычнай традыцыі. Агульначалавечыя праблемы, карэнныя пытанні існавання чалавека ў свеце пераносяцца ў міфалагічную сферу.

Над «Дуінескімі элегіямі» Рыльке пачаў працаваць яшчэ ў 1912 годзе ў старажытным замку Дуіно на беразе Адрыятычнага мора (адсюль назва). Першая сусветная вайна перашкодзіла Рыльке закончыць элегіі, якім ён надаваў выключнае значэнне. Яны былі завершаны ў 1922 годзе ў замку дэ Мюзо, у Швейцарыі.

У «Дуінескіх элегіях» з іх магутнай сімволікай перададзены складаныя перажыванні паэта, трывожныя думкі пра сучаснага чалавека, пра ўмовы яго існавання, роздум пра ролю і месца паэзіі ў лёсе чалавецтва. Рыльке імкнецца разарваць кола індывідуалізму, пераадолець адзіноту, бо адчужанасць ад людзей раўназначная смерці.

Успаміны дзяцінства, першы погляд на свет і непасрэдныя дзіцячыя адчуванні надзвычай дарагія Рыльке («...о вы, дзяцінства шчасныя гадзіны!»). Паэт услаўляе зямное існаванне: «Жыць на зямлі — гэта велічна!»; «Ператварэнне — вось наша няспыннасць жыцця».

«Санеты Арфею» напісаны ў 1922 годзе. У іх Рыльке звяртаецца да вобраза «бога-пеюна» са старажытнагрэчаскай міфалогіі Арфея, які мог усё падпарадкаваць свайму чароўнаму спеву, здольны быў пазнаць любыя тайны існасці. Песні Арфея, на думку Рыльке, увасабляюць сэнс мастацтва, а «спеў ёсць жыццё».

У выключна пластычных і сонечна-музычных «Санетах Арфею» Рыльке сцвярджае гарманічны пачатак у жыцці, ператваральную моц мастацтва. У склада-

ных метафізічна-міфалагічных вершаваных пабудовах узнікае філасофская катэгорыя ісціны, якая супрацьстаўляецца ісціне буржуазнага свету. Вершы Рыльке прасякнуты трагічным, але светлым настроем:

Мы — на тысячы год! бо бацька і маці
плодныя будучым; спеліцца наша дзіця,
што, паўтарыўшыся, перасягне нас у шчасці.

Новыя рысы ўласцівыя і фармальнай структуры паэзіі Рыльке. Паэт нярэдка адмаўляецца ад страфічнага члянення вершаў, ад рыфмы. Аднак пры ўсёй метафізічнай глыбіні і інтэнсіўнасці філасофскіх роздумаў познія вершы Рыльке вызначаюцца высокай лапідарнай прастатой, зладжанай і дакладна пабудаванай вершаванай формай. Невыпадкова Рыльке выбірае форму санета. Форма ж «Дуіненскіх элегій» ідзе да Гётэ і Гёльдэрліна, а праз іх — да самой антычнай паэзіі.

«Дуіненскія элегіі» і «Санеты Арфею» — выніковыя творы Рыльке, яго паэтычны запавет.

Паэзія Рыльке характарызуецца ёмкасцю зместу, эмацыянальнай напружанасцю, высокай натуральнасцю, выключным лірызмам і музычнасцю. Паэзіі Рыльке ўласцівыя глыбокі аналітызм, вытанчаны псіхалагізм, што збліжае яе з мастацтвам майстроў псіхалагічнай прозы.

Апошнія гады жыцця Рыльке былі азмрочаны цяжкай і пакутлівай хваробай — белакроўем. Памёр паэт 29 снежня 1926 года.

Паэзія велізарнай душэўнай сілы зрабіла Рыльке ўжо пры жыцці адным з самых любімых і вядомых паэтаў свайго часу. Не без рэлігійных настрояў, блізкая да сімвалізму і імпрэсіянізму, яна тым не менш супрацьстаяла пашыраным у тую эпоху спробам разбурэння паэтычнай формы.

Рыльке высока ўздымаецца над узроўнем аўстрый-

скай і нямецкай паэзіі пачатку XX стагоддзя. «Дасканальным знаўцам і майстрам нямецкага слова, які ўзбагаціў нямецкую паэзію цудоўнымі творамі», назваў яго І. Р. Бэхер. А. В. Луначарскі бачыў у Рыльке «адну з найвялікшых індывідуальнасцей цяперашняга нямецкага Парнаса».

Пасля другой сусветнай вайны Рыльке самы папулярны нямецкі лірык. Яго творы часта перавыдаюцца. У 1962—1963 гадах у ГДР выйшаў трохтомны збор яго твораў.

Лірычная і філасофская паэзія Рыльке зрабіла вялікі ўплыў на развіццё не толькі нямецкамоўнай, але і сусветнай літаратуры. Матывы яго творчасці знайшлі развіццё ў паэзіі Б. Пастарнака, Л. Фюрнберга, Г. Маўрэра, М. Яструна.

Б. Міцкевіч



МЫ — ТОЛЬКІ РОТ. А СЭРЦА ЯК АПЕЦЬ
У РЭЧАХ? ТОЙ МАГУТНЫ ЎДАР, ЯКІ
НА КВОЛЫЯ ПАДЗЕЛЕНЫ ШТУРШКІ
У НАС? ЯГО ВЯЛІКІ БОЛЬ СЦЯРПЕЦЬ
І ВЕЛІЧ РАДАСЦІ — НЕ МАЕМ СІЛ.
І ВЫРЫВАЕМСЯ З ЯГО ЗУСІМ; —
МЫ Ж — ТОЛЬКІ РОТ.
А ТОЙ ВЯЛІКІ ЎДАР —
САРДЭЧНЫ НАШ УЗЛОМВАЕ СПАЧЫН —
І МЫ КРЫЧЫМ...
ТАДЫ МЫ — СУТНАСЦЬ, НОВЫ ТВОР І ТВАР.

ШОНЭК, ВЕРАСЕНЬ 1923

Напісана пані Агнес Рэнальд для больш шчырага і сардэчнага ўспрыняцця ёю гэтай кнігі.
Райнэр Марыя Рыльке

З кнігі
«АХВЯРЫ ЛАРАМ»
(1895)

НАРОДНЫ НАПЕЎ

Сэрцам тужу,
слухаю і знемагаю:
песня багемскага краю
томіць душу.

Чуецца мне
голас дзіцячы на полі —
ён не змаўкае ніколі,
нават у сне.

Дзе б ты ні меў
потым прытулак на свеце —
вечна ўспамінам звінецьме
гэты напеў.

З кнігі
«УВЯНЧАНЫ МАРАМІ»
(1896)

І ЯК ДА ЦЯБЕ КАХАННЕ ПРЫЙШЛО...

(З цыкла «Кахаць»)

І як да цябе каханне прыйшло?
Як замець пялёсткаў, як з цемры святло,
як боль малітоўны? Сказала:

Адкрыла каханне ў нябёсах акно,
і, крылы згарнуўшы, упала яно
мне ў сэрца і закрасавала...

З кнігі
«ЧАСАСЛОЎ»
(1899, 1901, 1903)

«КНІГА ПАЛОМНІЦТВА»
(1901)

* * *

...Я той, паслужлівы твой послух,
хто на каленях гасіць свой парыў —
дзіця тваіх стваральных спраў узнёслых
і той, хто сам цябе сабой стварыў.
Я — голас ціхае каморы,
глухі да марнасці людской,
ты — хваля ўспененая ў моры
усеабдымнасці. Я — твой.

Няма ж нічога. Зрэдку ледзь
з вады ўздымаюцца атолы
ды, як маўчанне, слабкі, кволы
ўзлёт скрыпак, немыя анёлы
і той, няўзрушлівы, як цвердзь,
заступнік рэчы і жывёлы,
што ўсім дае жыццё і смерць.

Ці ж ты — Усё, а я — Часціна,
што вечна скардзіцца павінна
і выстаўляць свой горкі плач?
Бадай што я — *Усё*, Прычына,
а ты — Часціна, мой Слухач.

Няўжо ўспрымаеш ты з-за мура
яшчэ чыесьці галасы?
Кіпенне буры? Я ж ёсць бура! —
табе шумяць мае лясы.

Ці голас песенькі самотны
мяне даслухаць не дае —
і песня ж — я, адзін, гаротны,
паслухай споведзь-жаль яе.

Я той, хто завідна ў адчаі
заве цябе — адкрыцца мне,
а прыйдзе ноч і затачае
мяне ў маёй глухой турме,
дзе я, адрынуты нябога,
адзін у цемрадзі нары,
дзе рэчы побыту людскога
стаяць, нібы манастыры,
што сталі мне замест астрога.
Тут мне якраз патрэбен ты,
двайнік пакут маіх святы,
спагаднік болю і нядолі —
як хлеб, патрэбен мне тады.
Не бачыш, божа, ты ніколі,
што ўсе паслушнікі твае,
старцы, дзяўчаткі і малыя,
калі ім волі не стае,
не спяць, бяспраўныя, нямыя,
як вязні ў камеры апошняй,
то ходзяць тупа, то ляжаць,
іх рукі бледныя дрыжаць,
як ганчакі перад пагоняй,—
так смерць жывою сілай б'е.
А перад імі трупы, ямы,
былое явою ўстае,
ды знакі веснік падае



Бюст работы паэтавай жонкі
Клары Рыльке-Вестгоф.



Райнэр Марыя і Клара Рыльке, 1906 г.

у чорнай мантыі ля брамы,
хоць ноч яшчэ ўздыхае глуха,
яшчэ не чуе золку вуха,
яшчэ і певень не пяе.
Ноч — дом вялікі. І дарма
той вязень б'ецца, як сляпы:
за мурам зноў-такі ж каморы,
і сутарэнні, і скляпы,
тупыя ходы, калідоры —
а брамы ў свет нідзе няма.

І кожная ж — *такая* ноч:
жывуць у ёй, не зводзяць воч,
цябе шукаючы, мой бог,— іх процьма.
Старцоў ты чуеш тых, якія,
у цемры торкаючы кіем,
сыходзяць з лесвіц чорных залаў —
яны відушчыя і ўпоцьмах?..
Ці чуеш горыч іхніх псалмаў?
Павінен, мусіш чуць, як іх калені
таўкуць бяздушнае каменне,
бо плачуць жа, бо плачуць...

2 Зак. 2388

«КНІГА ГАЛЕЧЫ І СМЕРЦІ»
(1903)

* * *

Мой бог, да кожнага прыходзь і сцвердзі
яго ў жыцці, у тым жыцці, дзе ёсць
Любоў. І Сэнс. І Боль. І слодыч Смерці.

* * *

А беднасць ёсць вялікі светач глыбіні...

* * *

Галетнік беспрытульны ты і ўбогі,
як камень без гнязда, без месца ты,
як пракажоны йдзеш наўзбоч дарогі
з трашчоткаю, мінаеш гарады.

Ты — нібы золкі продзімень з паўночы,
скалелы выпладзень нягод людскіх,
каму агораны рызман сірочы —
замена мантый самых дарагіх.

Ты — плод слабенькі ў лоне, трапяткі.
Ён ледзьве дыхае, калі ў прычыне
ад страху сцёгны сціснуцца дзяўчыне,
каб першыя суняць жыцця штуршкі.

Ты бедны, як вясенні дождж рахманы,
што мірна лье на дахі гарадоў,
як мара вязня пра сусвет жаданы
у беспрасветным цемрыве муроў.
Як хворы той, што шчасцем апантаны,
калі яго павернуць; як расліны,
што сумна квецяцца ля каляіны;
ты бедны, быццам у слязах далонь...

Сабака валацужны і нясыты,
ці птах, што стыне без дупла ў мароз,
ці звер, у сетках лоўчых недабіты,
лаўцом нядбалым кінуты, забыты,—
з *іх* доляй ці зраўняецца твой лёс?

Бадзяг з начлежак лёс які ўжо чорны,
а твой чарнейшы, ён — бы змрок труны:
хай не млыны яны, хай толькі жорны,
а хлеб надзённы змелюць і яны.

Юдольнік беспрытульны, беспрытомны,
жабрак без твару, цень жывы і тло,
як ружа беднасці, убога-скромны,
бляск залатой аслепленай мамоны,
у сонцаператвораны, ў цяпло.

Без роднага жытла, юрод бяздомны,
ты ў свеце ўтульнасці — дзікун,
крычыш у буру; ты — як арфа тая:
ледзь толькі хто на ёй зайграе —
рассыплецца ад дотыку да струн.

* * *

О ты ўсёведны, на чые скрыжалі
накрэсліла галеча прахлы знак,
зрабі ж, каб беднасцю не пагарджалі,
каб не таўклі убогіх, як сабак,—
ураўнаваж усім ім лёсу шалі:
галеча вырастае з цемнаты,
як мята з кораня, што пахне ў жалі
праз далікатныя свае лісты.

* * *

Зірні і ўбач, на што яны падобны:
ад сілы ветру іх залежыць рух,
іх сон глухі, у ім агонь патух.
А позірк іх вачэй узнёсла-годны:
так наляціць знянацку дождж дробны —
і ўжо зацьміўся летні луг.

* * *

Яны спакойныя; амаль як рэчы.
Пакліч у дом — прыходзяць, акурат
як добрыя сябры, і, ўгнуўшы плечы,
сядзяць забытыя ў сваёй галечы
і цьмяцца, як бяздзейны апарат.

Нібы вартуюць скарбніцу самотна,
а скарб той не даступны ім самім;
яны — як човен у віры марскім,
як у бялільні чыстыя палотны,
развешана-паказаныя ўсім.

* * *

Глядзі, як па жыцці іх ногі йдуць:
сто раз пятляючы, як звера ногі,
успамінаючы сто раз дарогі,
і снег, і вецер, вострыя парогі,
і росны луг... а ногі аж гудуць.

І з той вялікай мукі капаюць іх слёзы,
галечы і пакутніцтву праклён;
на іх маўклівыя прыпала лёсы
тваіх вачэй таптаць скупыя росы,
бальзам травы і крамяныя лёзы —
так пальцы топчуць струн празрысты звон.

* * *

І рукі іх дзявочай ласкай надзяць
і ласкай матак, што жыццё даюць,
турботай птушак, што дамоўку ладзяць,—
яны душу даверліва гладзяць,
крананнем келіха, з якога п'юць.

* * *

Не дыхалі іх вусны, не трымцелі,
не цалавалі; на скульптурным целе
астылае жыццё, што аджыло,
бярэ праменне формаў і святло
і мудрасцю здаецца; паралелі
у гэтым толькі, камень мёртвы, тло...

* * *

І голас іх, пранізваючы даль,
разбуджаны на досвітку свяцілам,
прарваўшы нетры часу жывасілам,
пагутарыўшы сонна з Даніілам,
даносіць з мора вечны голас хваль.

* * *

І спяць яны, аддаўшыся той волі,
што моўчкі іх бярэ, каб спажываць
і змроку стынь, і золку свежы холад,
і целаў іх спакутаваных голад.
І падаюць дажджом яны паволі,
каб з цемры — юнай плоднасці дастаць.

І ўжо няма ад іх імя *нічога*
на целе іх, гатовым прарастаць,
як семя з семені, з якога
ты здолееў з вечнасці калісьці ўстаць.



I целам кожны з іх — нібы жаніх,
нібы ручай цячэ на ўлонні лета,
жыве прыгожа ў харастве прадмета,
і стомлены, цудоўны рытм у іх.
У статнасці іх — слабасць, як адмета
жаночых мук, чакаючы якіх,
на ўлонні сораму ён зноў прыціх —
жывы дракон з прытоеным імпэтам.



I будуць на зямлі пладзіцца людзі,
і не сатрэ іх часу плынь у прах,
і ўсцелюць злагадай зямныя грудзі,
як ягады духмянасцю ў барах.

Яны шчаслівыя; яны ў адчаі
ад ліўняў не схаваліся пад дах,
яны пажнуць яшчэ свае ўраджаі
і пакаштуюць спеласці ў пладах.

Яны навек прадоўжацца ў бяздонні
за край багацця марнага зямлі
і ўздымуцца высока, як далоні
ад працы адпачылыя, калі
усіх саслоўяў людзі знемаглі.

* * *

Узвысь іх з прорвы гарадской віны,
дзе лютасць іх зняверыла, гібенне,
бо кожны дзень у сумятні адны
з цярпеннем раненым гарачь яны.

Няўжо ім месца на зямлі няма?
Каму вятры? Каму празрыстыя крыніцы?
Хіба і сажалка ўжо сніць дарма,
каб дастуліцца ў іх прытулак ніцы?
Ім так нямнога трэба: ўкараніцца,
а плоць, як дрэва, возьме ўсё сама.

* * *

О, дзе ж ты, Ясная? Чаму ніколі
не распасцерла ты магутнай волі
па-над надзеямі святла, дабра?

Чаму не апраменіла юдолі,
о ты, Вячэрняя Зара?

З «КНІГІ ВОБРАЗАЎ»
(1902, 1906)

ІНІЦЫЯЛ

Аддай сваю нам прыгажосць,
не разважаючы, што будзе.
Маўчы. Яна адкажа: «Ўсё, што ёсць
вялікае ўва мне, у кроў і ў плоць
няхай ульецца людзям».

ПОСТУП

І зноў жыццё маё шуміць; глыбока
у берагі паток яго адзеты.
Зноў роднымі мне робяцца прадметы,
зноў бачыць свет мяне сваім прарокам.
Бязмоўнае ўспрымаю я шырока:
калі ў святло завоблачнага краю
у мроях птушкаю сягаю,
калі прынадаю ў раку ныраю
і, рыбкай схоплены, жыву.

СУР'ЁЗНАЯ ГАДЗІНА

Хто галосіць цяпер недзе ў свеце,
без прычыны галосіць у свеце,—
галосіць па мне.

Хто смяецца цяпер недзе ў свеце,
без прычыны смяецца ў свеце,—
смяецца з мяне.

Хто вандруе цяпер недзе ў свеце,
без прычыны вандруе ў свеце,—
ідзе да мяне.

Хто канае цяпер недзе ў свеце,
без прычыны канае ў свеце,—
той бачыць мяне.

ВУСЦІШНАСЦЬ

У звялым лесе крык, птушыны крык,
бяздумным ён здаецца ў звялым лесе.
І ўсё ж угрунтаваны круглы крык
у мігу тым, з якога ўзнік,
шырокі, нібы неба ў звялым лесе.
Усё ўвабралася ў птушыны крык:
увесь абсяг зямлі і ветру ўзмах,
спакой бязгучнасці ў паветры,
кароткі міг, што сам — працяг,
што сам — прыцін і спрах, нібыта знае,
чаму жывое памірае,
прайшоўшы крыку нетры.

ЦІШЫНЯ

Чуеш, каханая, ўскрыліў я рукі...
Чуеш ты шолахі іх...
Можа, прадметы падслухалі рухі
скрухі ў самотных сэрцах людскіх?
Чуеш, каханая, веек шолах,
у шэлесце іх — ты сама,
чуеш, каханая, чуйны іх сполах...
...толькі цябе тут няма...

Кожнага руху адлюстраванне
ў ціпіы шаўковай відно; застыў
несакрушальна, навек, на экране
далечы немай — мой кожны парыў.
Подых мой кожны ўздымае, калыша
зоркі.
Водар я п'ю, што прыйшоў з цішынёю.
Бачу я вобраз далёкі —
анёлкі.
Думаю я пра цябе. Толькі
ты не са мною.

СУЗІРАЛЬНІК

Па дрэвах бачу, іх вятры
сякуць без жалю. Завіруха
брынчыць у шыбы: нешта глуха
вяшчае з далечы мне скруха.
А што? — не зразумець без друга,
не палюбіць мне без сястры.

Ператваральная навала
праз бор і час ідзе здаўна,
нібы прыродзе веку мала,
нібы, як слова ў псалме, стала
жыццём і вечнасцю яна.

Мы скрышым дробныя няшчасці,
вялікія — пакрышаць нас!
Калі б у сэрца буру ўкласці,
мы сталі б волатамі страсці,
Нічым і Усім у гэты час!

Перамагаючы малое,
драбнееш сам — нікчэмны плён.
А Вечнае, а Небылое
не йдзе *самохаць* у палон.
Вось так анёл, біблейскі волат,
з працаўнікам вёў гожы бой:
ён сціснуў ворага штосілы
і, нібы струны арфы, жылы,
іх металічны востры холад,
іх тонкі спеў адчуў рукой.

Каго анёл адольваў, *той*
выходзіў прасвятлелы з бою,
удасканалены душой,
магутны, ўсцешаны сабою.
Ён не абражаны зусім,
бо ён навучаны змагацца
і моцы мужнага скарацца —
і ў гэтым рост ягоных сіл.

АСЕННІ ДЗЕНЬ

Паспела лета, ўпёкся хлеб. Пара,
мой бог, укрыць ад скварy дар прыроды
і даць разгону восеньскім вятрам.

Дай трошкі сонца на даспеў; яно —
каб пырскаў сокам кожны плод румяны,
яно — каб слодыччу быў кожны п'яны,
каб цяжка-цягкае было віно.

Бяздомны не агорае жытла,
разлучаны не выб'ецца з самоты,
пісаць пачне ці будзе без ахвоты
бадзяцца між прысадаў ля святла
па залацістых россыпах лістоты.

КАХАЦЬ

Без цябе мне так тужліва, слёзна —
я плыву, як з рук жывы пясок,
мне працівіцца ўжо стала позна
звабнасці, што ўладна і сур'ёзна
падхапіла ў свой мяне паток...

...час маўклівасці. Усё ў ім строга —
ён не здраджваў мне і не крычаў;
мой спакой, нібы спакой парога,
па якім струменіцца ручай.

А цяпер прадвесне ўзварушыла
зноў мяне, ад часу адкрышыла,
ад таго, што ўжо — здабытак тла.
Цёплую душу маю на мукі
нехта выдасць у чыесьці рукі —
знаць душа не будзе, што жыла.

АДЗІНОТА

Як дождж, як мроіва, як слота,
назойлівая наша адзінота.
Ўстае з раўніны, з мора і з балота,
згушчаецца ў нябёсах і тады
ліецца з хмар, імжыць на гарады,

на золку сочыцца яна, цярусіць
на вуліцы маўклівыя, на целы
расчаравана-млявыя, што, мусіць,
знайсці не здолелі, чаго хацелі,
бо ўжо, абняўшыся ў *адной* пасцелі,
нянавісцю расплачваюцца ўпотай...

...І ў рэкі зноў сплывае адзінота...

PONT DU CARROUSEL

Сляпы жабрак на мосце. Ён адзін,
як паграні́чны слуп, стаіць забыта
і без надзей на лепшае, нібыта
вартуе плынь азораных гадзін,
што па-над ім цякуць у вышыні,—
навокал тлум віруе, шум, агні...

Ён тут суддзя над светам спрахла-душным,
пастаўлены на ростані вякоў,
ён — брама чорная ў свет мерцвякоў
перад натоўпам, пышным і бяздушным.

САМОТНЫ

Як мараход, прыгнаны воляй бур,
сярод тубыльцаў я — жабрак прыблудны.
Іх дзень, як слуп адгаблявана-нудны,
а мой — як далеч, поўная фігур.

Мой свет пустэльны, воку непрывычны,
як неабжыты Месяц. На Зямлі
іх свет утульны і аднаабліччны,
ў ім словамі пачуцці абраслі.

Прадметы, мною ўзятыя сюды,
прымаюцца варожа, незнаёма:
яны, як жэўжыкі, скакалі дома,
а тут змарнелі ад нуды.

ЦАРЫ

Нізка вершаў

I

У той былінны час жылі асілкі,
адвечны бор стагнаў, глухі і дзікі,
і рэкі паўнаводныя цяклі;
паклікалі вандроўныя калікі,—
і ён устаў з нямогласці, вялікі
Ілья, асілак мурамскай зямлі.

Бацькі ўраблялі ляды і выжары,
цягалі з расцяробаў валуны,
а выйшаў сын і разбудзіў абшары,
і разгарнуў аралам дзірваны.
Ён сек дубы, раскідваў камянюкі,
што вартавалі нерушы здаўна,
і з тых камлёў дрыготліва на рукі
карэнішчы спаўзалі, як гадзюкі,
угледзеўшы святло пасля цямна.

Расой падсілкаваўшыся, кабыла
адчула моц і пруткасць у нагах
і радасным іржаннем абвясціла,
што верхаўцу не здрадзіць у баях.
Спасцігглі разам: казачная сіла
іх на падзвіжніцкі пазвала шлях.
І скачуць... праз вякі, як праз хвіліны
(а хто сядзеў бязвольна, той спачыў),
бо хто, калі і як той час лічыў,
калі ў суцэльнасці ёсць свет адзіны.
І ёсць сапраўдная на свеце мера,
тысячагоддзе ў ім — не шлях, а крок.

І пойдуць тыя ў далечы наперад,
каго дачасна ўкрыў глыбокі змрок.

II

Яшчэ страшыдлы й вогненныя цмокі
былі на варце вотчын гадаўя,
яшчэ не вырас, не ўзмужнеў Ілья,
а смельчакі ішлі ўжо ў свет шырокі
з мячом і булавой на Салаўя.

Агнездаваўся злыдзень той крывавы
на дзевяці галінах — трох дубах:
ад жудаснага свісту жухлі травы,
і ад яго паганскае забавы,
як пошасць, панаваў усюды страх.

Вясновы досвітак аж коле ў вочы,
злавесна ўсё прымоўкла да відна —
ды тлумяцца навокал патарочы,
і прыцішак застылы — што мана;
а волаты ідуць праз гэту цемру
дрыготкім поступам у глухамань,
правальваюцца ў вычварную зеўру
бясследна, як у багністую твань.

І толькі найдужэйшыя мужчыны
прайшлі жывыя посвіст салаўіны,
што з горла-жарала па ўсёй зямлі
шугаў і ледзяніў душу. Ішлі
яны ў лясы, сталеючы памалу,
насустрач красавіцкаму прагалу
вясны, цяпла... Яны перамаглі
жывёльны страх і вось ужо на ўзлессі
пабудавалі гарады і весі
і знішчылі свой страх, сваю хімеру.

І давялося ўжо лясному зверу
самому ратавацца ад аблогі:

3 Зак. 2388

пакінуць лежні, норы і бярлогі,
скарыць свой нораў і прасіць даверу,
заступніцтва і шчырай дапамогі —
і пакланіцца чалавеку ў ногі.

III

Часцей і часцей прыбліжэнцы цара
карміліся крошывам з дзікіх чутак,
а чуткі былі пра Яго, ўладара...

Аблашчанцы ўпрочкі беглі з двара...

Жанчыны шапталіся... ў кожны закутак
ён моўчкі заглядваў, напружана слухаў,
і чулася часам пужліваму вуху
то слова жахлівае «нож», то «атрута»...

Ні скрыняў ля сцен, ні ўслонаў; панура
туліліся цені забойцаў да мура,
з сябе чарнарызнікаў выдаючы.

У вусцішнай моўчы адно не ўсачы
злавеснага зірку ці рыпу маснічын,
адно не ўцікуй асцярог таямнічых,
не сцісні злавесна цяжкога жазла —

і смерць... Ды трошкі яшчэ берагла
парчовая рыза (пад ёй кіпцюрамі
старэчае цела драў холад кудлаты).
Каму можна верыць? Калі з-за вугла
накінецца страх, прапахлы мурамі,
што гоніць яго праз глухія палаты,
праз строй ненавісны баяраў паганых,
у морак захутаных, недапытаных,
праз рукі абвіслыя...
адна з якіх...—

І ён на бягу часам вырве з іх
маўклівага строю якогась манаха,
і люта пад ногі сабе шпурне...
Задумліва прывід стыне ў акне:
Хто сёння за ката? Каго прыме плаха?
Хто сам я? Хто ён? Што ён мне?..

IV

Вось час, калі аслеплая краіна
у люстры славы ўгледзела свой твар.

Атожылак апошні, званнем цар,
да ўшанавання звыклы, да фанфар,
душой трымціць на троне, як трысціна,
і ў той бязвольнасці несамавітай
рука паўзе з пурпурных аксамітаў
у вір ілюзій, голых мар.

Нібыта ўдзельную грызню татары
у кажухах, нацягнутых на латы,
яго маўчанне слухаюць баяры,
і нецярплівасцю гараць пагляды...
Шаноўнай пыхі — поўныя палаты.

І ўспамінаюць іншага, кашмары
яго буянстваў і суровай кары,
калі ён лобам іх аб мур гваздаў.
І помніцца, як *той,* калі сядаў
на гэты самы аксамітны трон,—
падушкі задам падмінаў ямчэй.

Бо змрочнай *мерай рэчаў* стаўся ён,
і доўга крылася ад іх вачэй,
якога ж колеру ядваб цячэ
з-пад царскай рызы залатой.

І думалі яны, што пышнасці такой
нашчадак не ўтрымае на плячах.
Бо хоць і свечкі ўсе гараць наўкола,
але жамчужны бляск нібы ачах,
і, як таму, былому, арэолам
не асвятляе царственную голаў
рубінамі абшытая парча,—
ўся веліч голая глядзіцца квола...

Іх памяць не патухла...

Яны ліслівa туляцца да трона,
ды блякне, меркне царская карона,
і волю царскую з'ядае ржа;
памазаннік, ён верыць іх паклонам,—
а ў тым халопстве ўжо крыху прымглёна
нібы прабліcквае лязо нажа.

V

Самотай ахаваны ад каварства,
бяссільны цар не згіне ад нажа,
ўрачыстасць прыме ў спадчыну і царства —
па іх баліць пяшчотная душа.

Ужо цяпер з акна сваёй святліцы
ён далечы дзяржаўнае сталіцы
праглядвае праз чорны змрок начны,
і ў першы дзень вясны кладуцца гулка
на дух бярозавы крывых завулкаў
прызыўнай ютрані званы.

Званы вялікія гудуць сурова —
яны цары мінулага, якія
з часоў татаршчыны прайшлі жывыя
праз кроў і смерць, праз рэкі агнявыя,
узнікшы з крыўды, з гневу паступова.

І зразумеў ён, хто яны такія,
што авалодалі яго душой,
што і *яго*, манарха з божай волі,
хто прагне ад людзей патолі,
завуць увысь з прастольнае юдолі
высакароднай мараю сваёй.

І цар самотны ў грыдніцы пустой
душэўна дзякуе званам за клічы,
што надзяць дух яго й жывую плоць
вантробнай прагай — продкаў пабароць,
чыё жыццё — як росхрыст таямнічы,
раскошна мгліцца з фрэскі залатой.

Нібы ў парчовай тканцы серабро,
ён *сам сабе* ў мінулых *дзеях* сніцца,
якім наканавана паўтарыцца,—
каб мудрасцю яго магло зацьміцца
былых цароў дзяржаўнае дабро.

VI

Яшчэ гараць сапфіры і рубіны,
нібы ўтаіўшы у сабе прынаду
дзявочых воч, і ў вязі веццяў саду
відны звяроў вясельныя гадзіны
і паціна разьблёнае карціны,
жамчужыны на золаце акладу
хаваюць полымя яе пагляду.
У мігатлівым руху са сцяны
зіхціць карона, скарбы даўніны
пераліваюцца, нібыта хвалі,
нібы на сонцы мора збажыны.

У бляску іх цямнеюць тры авалы:
глядзіць аблічча Маці праз узор,
абапал рукі ў міласэрным жалі,

нібы міндаліны, і на дэкор
кладзецца скрухаю нямы дакор.
І абвяшчаюць цёмныя далоні,
што царства спеліцца ў старой іконе,
якім запоўніцца блакіту ўлонне
ў адзінаісным Сыне, што ў сутонні
зару запаліць з вечна ясных зор.

Пра гэта рукі сведчылі, а твар —
шырокай брамай вабіў на абшар
журботных вуснаў літасцівай дзевы,
дзе ўсмешкі лёгкай цёплыя павевы
згасалі ў бліках кволага святла.
І, пакланіўшыся, прамовіў цар:

«Няўжо не чуеш ты, чыё абліччa
душу адчаем роспачным казыча,
як прагну я любві? Куды знік твар,
што вечна кліча нас? Куды ён кліча?

Так недаступны нам святы алтар!»

У цяжкай рызе цар зусім скалеў.
Ён знаць не знаў, даведацца не смеў,
як блізкі ён яе нямой журбоце,
як прыкра венцаносцам на самоце.

Цар думу думае ў турме палат,
схаваўшы ў пасмах валасоў той спрат,
дзе, скіраваны ў спрахлае, пагляд
прыцхіх; а твар, як той другі, ў авале,
у залаты агорнуты аклад.

(Каб зблізіцца з яе паглядам.)

Дзве рызы золатам гарэлі ў зале
і прасвятляліся ў святле лампад.

ТЫТУЛЬНЫ ЛІСТ

(З цыкла «Галасы»)

Добра жыць моўчкі шчаслівым і сытым;
хто яны — ведаць не трэба людзям.
Плакацца ўголас павінен прыбіты,
мусіць казаць: я асколак жыцця,
ці: я сляпы, ці: я слепну ў галечы,
ці: дай мне, божа, лёс чалавечы,
ці: захварэла маё дзіця,
ці: я качуся няспынна ўніз...

Можна бясконца дапісваць спіс...

Ці не таму, што натоўп мінае,
кожны з іх вымушана спявае...

Ах,— той голас! Шчыры, душэўны!

Дзіўныя людзі: ідуць захапляцца
ў хоры дзяцей галаском пакладанца.

Явіцца бог, не дапусціць падмены
ісціны звонкай скуглой абразанцаў...

З кнігі
«НОВЫЯ ВЕРШЫ»
(1907)

ПАНТЭРА

(У батанічным садзе. Парыж)

Хада, хада паўз драцяныя краты
стаміла зрок яе; і ўжо сама
ўжылася ў свет замкнуты і стракаты,
за кратамі і свету больш няма.

А лапы мякка, скрадліва паволі
кладуцца ў вузкім коле, акурат
як танец сіл вакол магутнай волі,
аглушанай, зняволенай між крат.

І толькі часам, як расплюшчыць вока,
адбітак свету ў змрок яго нырне,
па целе пругка пройдзе і глыбока
у сэрцы сцішана засне.

АРФЕЙ. ЭЎРЫДЫКА. ГЕРМЕС

Там быў руднік дзівосны, душ капальня,
што срэбнымі пражылкамі цяклі
праз цемру несусветную. Карэнне
крывёй крынічыла, і да людзей
парфірам цяжкім кроў плыла. І больш
чырвонага нічога.

Там скалы
і неабжытыя лясы, масты
над пустатой.
І сажалка была,
вялікая, сляпая, нібы ноч,
навіслая над плоскім дном глыбокім,
як неба хмарнае — над краявідам.
Сярод лугоў самотна ўдаль вілася
дарога доўгая палоскай белай.

Дарогай гэтаю ішлі яны.

І першы быў мужчына статны ў сінім;
ступаў маўкліва, гледзячы наперад,
дарогу прагна мераў ён нагамі,
са складак вопраткі звісалі рукі
панура, цяжка, нібы ўжо забылі
пра лёгкасць ліры, што сама ўрастала
пад левы локаць струнамі, як ружа
ўрастаецца шыпамі ў сук алівы.
Раздвоены былі яго пачуцці,
бо позірк, як сабака, бег наперад,
вяртаўся і, спыніўшыся, чакаў
на бліжнім павароце ўзбоч дарогі,
а слых і нюх ад следу адставалі,
і часам падавалася яму,
як быццам чуе крокі тых дваіх,
што мерна недзе там за ім ступалі.
І цішыня.
Хіба што шоргат крокаў,
шум ветру за плячыма, шалахценне
плашча. «Ідуць»,— казаў ён сам сабе,
каб чуць, як нікне, аціхае голас.
А тыя двое ўсё ідуць, хоць, праўда,
зусім павольна і няспешна.
Калі б адважыўся ён азірнуцца

(а гэтым ён разбурыў бы прыгоду,
якой цяпер аддаңы), ён бы ўгледзеў,
што моўчкі следуюць абое:

бог вестак і вандровак — ён ідзе,
над светлымі вачыма цень ад шапкі,
і роўна тукае аб дол дарожны посах,
і на сандалях крылечкі трымцяць,—
а леваю рукой вядзе *яе*.

Яе, каханую ўсім сэрцам, ліра
аплакала за плакальшчыц усіх,
і з плачу гэтага явіўся свет:
лугі, палеткі, рэкі, лес і горы,
дарогі, сцежкі, жыўнасць і паветра,
і ў свеце цемрадзі зноў ззяла сонца,
і неба зорыла наўсцяж слязьмі —
Каханая...

І вось ужо яна йдзе поплеч з богам,
хоць рухі скоўваў доўгі белы саван,—
цярплівая, пяшчотна-трапяткая,
забытая ў сабе, як пры надзеі,
не думала пра мужа, што ішоў
наперадзе, не думала пра шлях,
які вядзе яе ў жыццё зямное.
Замкнулася ў сабе:
заглыбленая ў смерць сваю,
ў жыццё паверыць не магла.
Як плод на дрэве слодыччу і змрокам,
была напоўнена сваёю смерцю,
такою новай, што й не зразумець.

У новай цноце незямной яна
нявінная была, і нібы кветка
вячэрняя, цвіла тут чысціня,

і рукі ўжо адвыклі ад любоўных
крананняў мужа, так што нават бога
бясконца далікатны, лёгкі дотык,
як блізкасць, груба зневажаў.

Яна ўжо не была бялявая жанчына,
калісь апетая ў чароўных песнях,
не востраў водару на шлюбным ложку,
і больш не ўласнасць гэтага мужчыны.

. . . .

Расплеценая, што каса тугая,
пралітая, нібы залётны дожджык,
зямлі адданая без сіл жыццёвых.

І коранем яна ўжо стала.

Калі раптоўна
спыніў яе і ў роспачы прамовіў
бог словы горкія:
«Ён азірнуўся»,—
яна спыталася няўцямна:
«Хто?»

Далёка там, дзе цьміўся светлай плямай
да сонца выхад з царства мёртвых, нехта
стаяў паныла, і яго аблічча
не апазнаць было.
Стаяў і бачыў,
як на пабляклым пыле той дарогі
журботназоры бог і пасланец
бязгучна павярнуўся і пайшоў
за постаццю ў свет цемрадзі і ценяў,—
ёй рухі скоўваў доўгі белы саван,—
цярплівая, пяшчотна-трапяткая.

ПАЭТ

Адлятаюць гадзіны і сэрца
крыллем ранілі мне, летучы.
Я адзін: і няма куды дзецца,
часе горкі, ні ўдзень, ні ўначы.

Дзе каханне? Дзе дом? Дзе паэт
адпачне ад ганення людскога?
Я аддаў сябе свету самога,
а цяпер прадае мяне свет.

У ЗАЛЕ

Якая гожасць навакол! — паны
у камергерскіх фраках і жабо!
Як ноч вакол сузор'я, ўсе яны
сабой зацьмілі бляск свяціл. Або
ў карунках дамы млявыя, іх ручкі,
нібы ашыйнік у балонскай сучкі,
праблісквающь праз аксамітны змрок;
тут кожны — меламан, бібліяфіл,
ад нас не адыходзяць ні на крок —
крыніца мудрасці, здаровых сіл...

У іх свой лад, жыццёвы свой зарок,
ды не стасуецца з ім наша мэта:
ім хочацца цвісці: каб маладым —
прыгожы быў; мы ж хочам жыць, а гэта —
расці, састарыцца і даць плады.

ВАЗА З РУЖАМІ

Ты бачыў хлапчукоў, якія, злосна
счапіўшыся імгненна, у запале
нянавісці ўзаемнай, па зямлі
качаюцца, як звер пад роем пчол?
Ці помніш ты прытворшчыкаў-актораў,
шалёных коней сплецены клубок,
ашчэраных, з крывавымі вачыма —
нібы вылузваецца чэрап з храпы?

Цяпер ты знаеш, як забыць пра гэта:
перад табою ружы, ружы ў чашы,
у незабыўнай, бо да краю поўнай
занадтасцю быцця, амаль надмерам,
ніколінеспатольнасцю бясконцай,
нікомуненалежнай існасцю
і дасканаласцю, амаль як нашай!

Бязгучнасць і бясконцасць расхінання,
патрэба шырыні, але не той,
якую рэчы заціскаюць і звужаюць;
ледзь-ледзь-акрэсленасць, нібы прачыстасць,
суцэльная пяшчота-сарцавіна
і самаапрамененасць да дна —
што ёсць яшчэ, падобнае на гэта?

Што ёсць падобнае на дакрананне
пялёстка да пялёстка? Пачуццё?
Глядзі: павекамі растуляцца пялёсткі,
а там — суцэльныя павекі спяць,
каб непрабуднасцю сваёй паслабіць,
суцішыць сілу ўнутранага зроку?
Глядзі: калі праз гэтыя пялёсткі
святло ліецца з тысячы нябёсаў,

што кроплю цемры кожную працэдзіць,
як ззяннем вогненным прамыты, пругка
устаў разбуджаны пучок тычынак.

Глядзі: якое трапятанне ў ружах!
Такі малы ў іх вугал адхілення,
што нерухомымі здаюцца, быццам
іх промняў не рассейвае сусвет.

Ты бачыш белую ў шчаслівым цвеце —
адну сярод разгорнутых лісткоў,
нібы Венеру ў ракавіне бачыш;
альбо чырвоную, што сарамліва
к суседцы быццам хіліцца, а тая,
як холад, адхіляецца і зябне,
замкнутая ў паныласці сваёй
сярод разгорнутых, сярод паніклых.
Што ж ападае з іх так лёгка-лётка,
як цяжкі плашч, як мяккае крыло,
як маска з твару? *Як* з сябе скідаюць? —
Як лішак вопраткі перад каханым.

У ружы — ўсё! Вось жоўтая, хіба ж
расхрыстана-пустая гэта чаша
не завязала плод, не зберагла
у ім аранжава-чырвоны сок?
Другой цвіценне з цяжкасцю далося,
бо невымоўная ружовасць цвету
ліловай горычы ўзяла з паветра?
А вось баціставая, як паненка,
сагрэтая пяшчотнаю кашулькай,
якую скінула з суменкай разам
у золка-сцішанай лясной купелі?
А гэта — як апалавы фарфор,
празрысты, крохкі, як кітайскі кубак,
як матавае крылца матылька,—
няўжо яна напоўнена адной сабою?

Усе яны напоўнены сабою,
бо іх саманапоўненасць і ёсць
іх знешні свет, іх дождж, іх вецер,
выспельванне вясны і вінаватасць,
і неспакой, і прыхаваны лёс,
і цемрыва вячэрняе зямлі —
і ўсё: да хмар, да зменлівасці хмар,
да наплывання хмар і расплывання,
да ўплыву ледзь улоўных зорак
усё бясконцае ператварэнне
змяшчаецца суцэльна на далоні.

Усё мы бачым у цвіценні ружаў.

АЛКЕСТЫДА

І тут з'явіўся між гасцей вястун.
Быў кінуты сюды ён, як акраса,
на шлюбны пір, што ўжо астыць паспеў.
Але вясельнікі не адчувалі
нячутных крокаў бога. Ён святыню,
як мокры плашч, праносіў асцярожна,
і, пэўна, кожнаму з гасцей прысутных
памроілася нешта, бо ён раптам
угледзеў на другім канцы стала
гаспадара: ускочыўшы з падушак,
уздыбіўся ад жаху той, і твар,
і ўся пастава жудасць выяўлялі.
Ды раптам зноў настала цішыня,
нібы на дно асеў увесь асадак
глухой, незразумелай гаманы...
Аднак адразу ўсе смурод адчулі

пратухлага, бо нежывога, смеху.
І ўсе адразу тут пазналі бога,
фатальнага пазналі вестуна,
і зразумелі сэнс яго з'яўлення...
І ўсё-такі навінаю жахлівай,
як самае няўцямнае на свеце,
здалося ўсё, што статны бог сказаў.
Адмет памрэ. Калі? Праз гадзіну.

І той пачаў аб сцены жаху біцца,
на друз раскрышваючы тоўсты мур,
да бога рукі працягнуў з мальбою,
выпрошваючы каліўца жыцця,
хоць год, хоць месяц, тыдзень,— не! —
не дні, а ночы — не, хай толькі ноч,
адна-адзіная, вось гэта ноч.
Адмовіў бог. І закрычаў Адмет,
прарэзліва, нястрымна, як крычала,
яго раджаючы ў пакутах, маці.

І паявілася старая маці,
і падышоў стары, нямоглы бацька —
збянтэжаныя, сумныя старыя.
Упершыню іх блізка ўбачыў сын,
і, крык суняўшы, раптам ён прамовіў:
мой бацька,
няўжо ты гэтак рэштай даражыш,
асадкам прахлым, што не лезе ў горла?
Аддай яго! А ты, старая маці,
матрона,
чаго сюды прыйшла? Ты ж нарадзіла.
Ён іх схапіў, трымаючы аберуч,
нібы жывёл ахвярных. Потым раптам
іх адпітурхнуў, працяты новай думкай,
і, ўвесь прасветлены: «Крэон!»—усклікнуў.
І больш ні слова, толькі-толькі гэта.

І твар яго асветлены быў Іншым —
не сказаным уголас, безназоўным,
запаленым, як лямпа над сталом,
яго любімым сябрам, маладым:
Ты ж бачыш, мне старыя — не замена,

яны — нішто ўжо, старасць, парахня.
А ты, а ты — краса і свежы сок...

І тут з вачэй яго знік добры сябар,
затое бачыць ён — ідзе яна.
(Здавалася, што паніжэла ростам,
маркотная была ў вясельных строях.)
Астатняе...— вось вуліца, якою
ідзе яна, ідзе... (вось падыходзіць,
непаслухмянымі рукамі ён...)

Чакае ён... Яна загаварыла
не да яго — да бога. Слухаў бог,
і кожны ў богу мог пачуць яе:

«Ніхто яму заменай быць не можа,
а *толькі я*. Ніхто на белым свеце
не паміраў так. Што ж сабе вазьму
з мінулага? У *гэтым* — смерці сэнс.
Няўжо ты ад яе, сюды йдучы,
пра ложак наш нічога не дазнаўся,
што ён таксама (ложак) — з царства тлену?
Развітваюся я.
З сабою ўсё бяру. І я пайшла,
каб растварылася, прапала ўсё,
што пад маім каханнем пахавана...
Вядзі мяне! Замест яго памру!»

Як вецер, што мяняе свой кірунак,
так падыходзіць да змярцвелай бог,

і стаў адразу бог далёкі мужу,
якому непрыкметна ён шпурнуў
пад ногі сто гадоў жыцця зямнога.
А той, узрушана прасцёршы рукі,
да абаіх іх кінуўся, бы ў сне.
Яны пайшлі да выхаду, ў якім
жанчыны плакалі. І ўсё ж яшчэ
паспеў разгледзець ён яе аблічча
з прасветленай усмешкаю надзеі

і абяцаннем — зноў сюды вярнуцца
да мужа з царства ценяў, да яго,
яшчэ жывога...

Ён на каленях
стаяў, рукамі вочы засланіўшы,
каб з той усмешкаю пабыць сам-насам.

ПЕСНЯ КАХАННЯ

Як утрымаць душу мне, каб яна
не рвалася к тваёй? Куды ёй збегчы,
як пасяліць яе ў другія рэчы,
каб там з забытасцю сярод цямна
жыла адчужана, зусім адна,
у тым прадмеце, што не памаўчыць,
калі сама яна з глыбінь крычыць?
Ды ўсё, што нас хвалюе,— спалучае,
як смык, які ў суладнае гучанне
зліў галасы дзвюх струн *адзіным* скерца.
Хто нас наладзіў так? Хто так сумеў
сыграць на струнах нашых душ і сэрцаў! —
Салодкі спеў!

З кнігі
«НОВЫХ ВЕРШАЎ ДРУГАЯ ЧАСТКА»
(1908)

A mon grand Ami Auguste Rodin *

ЛЕДА

Калі пачаў увасабляцца бог
у лебедзя,— зачараваны птахам,
яго красу прымаючы са страхам,
ён адступіцца ад свайго не змог,—

так вабіла зямная прыгажосць
адпіць [redacted] быцця глыток любві адзіны.
Але яна праз вобраз лебядзіны
яго пазнала,— знала: прагне госць,

каб знемагла ад любасных прынук...
Бог апусціўся і, лагодна крылы
струменячы вакол аслаблых рук,

ён растварыў яе і сам растаў.
І сам адчуў прылівы новай сілы —
на лоне лебедзем сапраўдным стаў.

---

* Майму вялікаму сябру Агюсту Радэну *(франц.)*.

ЗАКЛІНАННЕ ЗМЕЙ

Калі на рынку прыкладзе да вуснаў
свістульку-флейту заклінальнік змей,—
то рэзкая, то мяккая ігра індуса,
бывае, што з мурашніка людзей

прывабіць слухача бліжэй да дудкі,
якая квола, ціхенька спярша,
змушае потым рытмам палка-гнуткім
рэптылію ўспружыніцца з каша,

пасля ігрой пагроз і ласкі — гада
змякчае зноў... Нарэшце, самахоць,
без флейты здольны ўжо факір паглядам
табе апатыю ўсяліць у плоць,

тугу смяротную. Як з неба замець
агнём акрые. І няма ўжо сіл.
Грымаса — твар. Прыправай вострай памяць
паўночную індус прыцерусіў.

Нішто цябе ўжо не ўратуе — позна!
І больш няма табе дарог назад —
ствалы наўкол выпростваюцца злосна,
трымцяць залозы змей, іскрыцца яд.

З кнігі
«РЭКВІЕМ»
(1908)

ВОЛЬФУ ГРАФУ ФОН КАЛЬКРОЙТУ

Няўжо цябе не ведаў я? На сэрцы
маім ляжыш ты, як пачатак ціхі,
але адгорнуты. Аднак пачну
сказ пра цябе, хто так ахвотна, палка
жадаў і стаў нябожчыкам нарэшце.
Ці ты знайшоў уцеху і палёгку
у нежыцці, ці ёсць у ім спакой?
Ці ты знайшоў там свой набытак,
дзе ўся маёмасць вартасці не мае?
Ты прагнуў край наведаць той, чый вобраз
яшчэ ў жыцці насіў перад вачыма,
хацеў праймкнуць звонку ў мілату
і лётка ўсцяж знутры яе абмераць.
О, каб цяпер узніклую з дзіцячых
ілюзій ты не давяршыў памылку;
о хай бы ты цяпер у плыні скрухі,
у вір захоплены і несвядомы
у лёце горкім да далёкіх зорак
здабыў нарэшце радасную ўцеху,
што ў паслясмерці марыў ты знайсці!
Так блізка быў ты да яе ў жыцці!
Так свойска ёй было ў жыцці, той мары
тваёй тугі, вялікай і суровай,
калі капаўся ты расчараваны
у шчасці і няшчасці непамысным
і ледзьве падымаўся пад цяжарам

сваіх знаходак: ты ж яе ў руках
трымаў, нязнаную дагэтуль радасць,
сваю выратавальніцу і ўцеху,
цяжар якой праз кроў ты нёс і вынес.

Чаго ты не чакаў, не спадзяваўся,
дык гэта — што цяжар такі вялікі:
гняце магутна, бо цяжар сапраўднай
уцехі ён. І, пэўна, быў наступны
ён міг твой, што ў вянку каля парога
твайго стаяў, а ты дзвярыма бразнуў.

О ўдар, як прасякае ён сусвет,
калі замкі накіне на адкрытасць
сухі скразняк людскога нецярпення!
Хто можа прысягнуць, што семя ў глебе
дарогу не праб'е; хто дасць заруку,
што хоць на міг у прыручоным зверы
не бліснс раптам позва да забойства,
калі маланкай мозг пратне жаданне?
Хто ведае, якою б'юць маланкай
у шпіль учынкі нашы; хто удар
прасочыць гэты з вынікамі разам?

Ты знішчыў гэта. І цяпер давеку
так пра цябе і будуць гаварыць.
Хай нават прыйдзе той герой, што з рэчаў
сарве, як маску, іхні знешні сэнс
і нам адкрыеісныя аблічны,
з якіх за намі ўсюды цікавалі
бязгучна вочы з дзірак патаемных,—
і ўгледзім мы сапраўдны твар нарэшце,
які змяніць ніколі немагчыма! —
Ты знішчыў гэта! Там ляжалі глыбы,
і рытм будоўлі дыхаў у паветры,
а ты хадзіў навокал і не бачыў
парадку ў іх: нібыта засланялі

адна адну, здавалася табе,
што кожная ў зямлю ўрасла карэннем,
калі хацеў ты, міма ідучы,
падняць іх, і не верыў, што падымеш.
Але ж ты іх падняў усе ў адчаі,
ды толькі каб пасля шпурнуць у пашчу
каменаломні; а яны не ўлазяць,
бо шчодрым сэрцам ты іх перабольшыў.
Калі б на гэты гнеў, пачатак гневу
далонь жанчына мякка апусціла;
калі б надарыўся ў хвіліну тую
маўклівы і задумлівы прахожы,
як ты ішоў да вызначанай рысы;
калі б твая тады пралегла сцежка
каля майстэрні, дзе куюць мужчыны
сваю будзённшчыну; каб толькі ў зрэнку
тваім хапіла месца для адбітку
руплівае казуркі, што настырна
адольвае цяжар і перашкоду,—
тады б і ты ў відушчым прасвятленні
змог прачытаць таемныя пісьмёны,
што ў памяці з дзіцячых год аселі
і час ад часу надзілі спакусай —
заглыбіцца ў іх сэнс, пакласці ў фразу;
але не здолеў ты спасцігнуць сэнсу!
Я знаю, знаю: ты ляжаў і мацаў
пісьмёнаў рысы, быццам на грабніцы.
І ведання свайго святло падносіў,
нібы паходню, да радка-загадкі,
але згасала полымя раней,
чым прачытаць ты мог, альбо, магчыма,
ад хвалявання дрогкае рукі,
ці ад дыхання, альбо проста так,
як сам сабой агонь згасае часта.
І ты не прачытаў. А мы не можам
праз далеч прачытаць, праз горыч страты.

Мы бачым толькі вершы; слоў падбор
даносіць нам святло тваіх пачуццяў.
О не, не ўсе ты словы браў,— часамі,
за цэлае прымаючы пачатак,
ты паўтараў яго, як запавет
журботны. О, няхай бы гэтых слоў
не чуў ніколі са сваіх ты вуснаў!
Цяпер зусім інакш чытае іх
на небе твой анёл, яго чытанне
мяне табой бясконца напаўняе,
бо гэта ты, бо твой мне кажа вопыт,
што дарагое ўсё павінна знікнуць,
што ў пільным угляданні адмаўленне
ад усяго спасціг ты і адчуў
у смерці поступ свой далейшы. Гэта —
усё тваё, мастак; усе тры формы
былі ў руках тваіх, былі адкрыты.
Вось першая: ліццё — тваіх пачуццяў
жывых прастора; а другая форма —
для светапогляду тварца, які
нічога не жадае і не прагне;
у трэцяй жа, якую ты сам знішчыў
паспешліва, як толькі з сэрца першы
струмень паліўся сплаву,— там была
сапраўдная сапраўднай варкі смерць,
якой найбольш патрэбны мы ў жыцці,
якая тут да нас найболей блізка.
Вось чым валодаў ты. Вось твой ратунак,
які ты часта адчуваў міжволі,
але баяўся пустаты халоднай
тых дзейсных формаў, чэрпаў з паражнечы
і скардзіўся. О біч старых паэтаў,
што ныюць, жаляцца, калі павінны
па праву гаварыць на поўны голас;
што вечна судзяць пра свае пачуцці,
калі павінны іх у твор закласці;

што лічаць усур'ёз дагэтуль, быццам
журбу і радасць ведаюць сваю,
а твора абавязак — толькі славіць
ці ганіць гэта вытанчанай рыфмай;
яны — як хворыя, гавораць слёзна
пра набалелае ў душы і целе,
замест таго каб словам стаць суровым
і ў слова боль і радасць пераплавіць,
як будаўнік сабора, што ў каменне
свае пачуцці ўкладвае — і ў творы
сваім жывы навекі застаецца.
Такі ратунак быў. Калі б хоць *раз*
ты ўбачыў, як у верш заходзіць лёс,
каб стаць, застаўшыся ў ім назаўсёды,
падобным вобразам ці падабенствам,
што раўназначны гэтаму партрэту
у рамцы на сцяне, дзе продак твой
падобны да цябе і не падобны —
і вытрымаў бы ты. Але дарэмна
і дробязна было б пра тое марыць,
што не збылося. Нават цень дакору
хай на цябе не падае. Усё,
чым радуе жыццё, ідзе хутчэй
за думкі і здагадкі уяўлення;
ні дасачыць, ні ацаніць не здольны
мы ўсіх праяваў нашага жыцця.
Не бойся, не саромейся, калі
цябе крануць нябожчыкі знянацку,
што калісь выстаялі да канца,
калі жылі. (А што лічыць канцом?)
Глядзі спакойна ў вочы ім, не бойся,
што па табе жалоба наша можа
у іх вачах цябе абвінаваціць,
бо словы гучныя з часоў былых,
калі сам твор відочны быў,— не нам!
Што — перамога нам!? Перамаганне — ўсё!



Рыльке, 1896 г.
Шарж, зроблены
сябрам паэта
Эмілем Орлікам.



Першы справа — Рыльке.
Рысунак Э. Орліка.

ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ
(1897—1925)

ТЫ ГАВАРЫЛА МНЕ, І СМУТНА...

Ты гаварыла мне, і смутна
журба таілася ў вачах —
як спеў любові шматпакутнай:
вось ён разліўся, вось ледзь чутна
самотнай нотаю ачах.

Прайшлі гады, прыйшла і ўдача,
у Лету кануў твой адчай —
душа пяе, і сэрца скача,
ды бачу я, што моўчкі плача
і рвецца, рвецца ў родны край.

1897

СУТОННЕ — КНІГА ЗАЛАТАЯ...

Сутонне — кніга залатая,
аклад пурпурны. І з замка
няспешна спражачку здымае
мая халодная рука.

Старонку першую чытаю,
і шчырасць радуе мяне,
з другою ціха засынаю
і ўжо аб трэцяй мару ў сне.

1897

БАЮСЯ ЛЮДСКІХ Я ДАКЛАДНЫХ СЛОЎ...

Баюся людскіх я дакладных слоў.
Усё людзі знаюць, усё ім відно:
вось гэта — сабака, а гэта — гумно,
тут бачаць канец, тут пачатак асноў.

Усё людзі знаюць: што ёсць і было.
Бянтэжаць мяне іх кепікі, злосць,
ні бруд іх не здзівіць, ні прыгажосць —
ад бога ў іх нават сад і жытло.

Ганю я нячыстыя помыслы прэч,
хай грае, спявае кожная рэч!
А вы безразважна, з нахрапам тупым,
і рэчы, і песні затопчаце ў пыл.

1897

* * *

Альфрэду Вальтэру Хаймелю

Дні, уяўна плывучы ад нас,
к нам вяртаецеся адчувальна;
мы, ператвараючы свой час,
прагнем быць у часе-днях рэальна.

1907

* * *

Зноў мы і зноў, хоць і знаем сакрэты кахання,
хоць помнім жаласны водгук імён на магілах,
і жахліва раз-зяўленай прорвы прадонне, ў якое
іншыя рухнулі,—
зноў мы і зноў удваіх выпраўляемся з хаты
пад векавечныя дрэвы на мяккую посцілку траў —
кветкі цвітуць там навокал, там неба над намі...

1914

ПАЧАТАК КАХАННЯ

О ўсмешка, першая ўсмешка, наша —
твая, мая. Ўдыхаць духмянасць ліп
і слухаць парк маўклівы... Раптам глянь
у глыбіню вачэй і... усміхніся.
Ва ўсмешцы гэтай успамін пра зайца,
што там, на ўлонні, бегаў па траве,—
тады было яшчэ маленства ўсмешкі;
о ўсмешка рухаў лебедзя, якога
угледзелі мы ў шэрані вячэрняй —
на сажалцы прыцішанай, прымоўклай...
І верхавіны ў небе чыстым, вольным,
яшчэ пакуль што не начным, не чорным,
усмешкай цепляць вусны на аблічча
зачараванай будучыні нашай...

1915

* * *

Пані Фанэт Клавэль

Той, хто душэўна замоўк,
мовы карэнне кранае;
кожны гук, вырасшы, мае
сілу для перамог:

выліць маўчання гром,
выкасаць кпіны злога
і з дапамогай слова
зло асудзіць на злом.

1924

* * *

Вернаму і дзейснаму пасрэдніку
Вітальду Гулевічу (Ольвіду)
з удзячнасцю

Райнэр Марыя Рыльке

Шчасце — ўсвядоміць, што невыказнасць
пазамоўна жыве,
што непасрэдна ў нашую яснасць
веліч адтуль плыве!

Так разнастайна ўсе мы наводзім
паразумення масты,
што ў захапленні агульным знаходзім
радасны свет паўнаты.

1924

НА ВУЛІЦЫ, СОНЦАМ АБЖЫТАЙ...

На вуліцы, сонцам абжытай, з калоды,
прадзёўбанай куксы камля, што даўно
стала карытам,— празрыстай вадой
сілу ўзнаўляючы, смагу спатольваю,
свежасць і сутнасць вады ў сябе
прыгаршчамі пераліваючы. Піць —
слова не тое, будзённае вельмі;
рух маіх рук запытальны, чакальны —
чыстаю вадкасцю студзіць мяне.

Ты ж бы прыйшла, я спатоліў бы прагу
гэтак жа — дотыкам лёгкім рукі:
ці то да плеч, іх акругласці юнай,
ці то да пругкіх грудзей.

1924

5 Зак. 2388



Цэлы свет быў у абліччы мілай —
раптам выліўся й разліўся ён:
не сабраць яго, не ахапіць.

Што ж не піў яго я з поўнай чашы? —
гэты свет любімага аблічча,
блізкі, і духмяны, і салодкі!

Ах, я піў. Піў свет я неспатольна.
Толькі перапоўнены быў светам
і, п'ючы, разліўся з берагоў.

1924



Рыльке.
Рысунак
Э. Орліка.



Другі справа — Рыльке. Рысунак Э. Орліка.

ІДАЛ

Бог ці багіня кашэчага сну,
ласае боства, што ў цемрыве-рота
спелыя ягады-вочы трушчыць,
сок ссаладзелы з бачання гронак,
вечна-святло ў паднябенных крыптах.
Не, не сон-песня.— Гонг! Гонг!
Тое, што іншых таймуе багоў,
гэтага хітрага бога вядзе
да яго ўлады, што падае ў цела.

1925

ГОНГ

Не для вушэй ужо...: Звон,
што, нібы вуха глыбінь
чуе уяўнасцю нас.
Выкрут прастораў. Эскіз
светаў з нутра напаверх...,
храм да-народжвання іх,
канцэнтраваны раствор
з нерастваральных багоў...: Гонг!

Сума маўклівага, што
толькі сябе вызнае,
зычны зварот у сябе
самазнямелага — і
вечнасці з руху выгнёт,
пера-літая зорка...: Гонг!

Ты, каго век не забыць,
плод разбурэння і страт,
неспасцігнення трыумф,
вуснам нябачным віно,
бура ў апорах калон,
звергласць дарожніка ў шлях,
нашая здрада ўсяму...: Гонг!

1925

ДУІНЕНСКІЯ ЭЛЕГІІ
(1912, 1922)

З уладання
княгіні Марыі фон Турн-і-Таксіс-Гогэнлоэ

ПЕРШАЯ ЭЛЕГІЯ

Хто ж бы з анёлаў, калі б закрычаў я, пачуў?
Нават калі б і пачуў і спагадна крануўся
сэрца майго, я сканаў бы адразу, забіты
сілай яго існавання. Сама прыгажосць —
гэта пачатак жахлівага. Вытрымаць гэты пачатак
здольныя мы; і любім вітаць хараство,
хоць яно грэбуе намі, знішчаць не спрабуе.
Вусцішны кожны анёл і жахліва прыгожы.

Так вось і я сунімаю парывы свае, сунімаю
покліч жахлівага плачу! Ах, ці хто-небудзь
нам тут патрэбен яшчэ? Анёлы — не, людзі — не!
Нават жывёлы спрытнейшыя тут заўважаюць,
як нам няўтульна ў свеце тлумачаным жыць,
дзе застаецца нам толькі пахілае дрэва,
дрэва над урвішчам, дрэва, якое штодня мы
бачыць прывыклі; а можа, ўчарашняя вуліца і
неадчэпная вернасць прывычцы, якая
нас не жадае пакінуць, таксама прывычна.

О, яшчэ ноч! Калі вецер сусвету нам студзіць
і паліць аблічча... каму гэта ноч застаецца,
ласкі і расчаравання жаданая ноч,
тая, якая ўсе сэрцы ў змрок свой прымае?
Можа, яна закаханым лягчэйшая? Ах,
толькі сабой засланяцца — такі іхні лёс.

Хіба *не ведаеш* гэтага? Кінь пустату
і прастору, якою мы дыхаем; птушкі, магчыма,
больш пранікнёна ўмеюць і могуць адчуць
расшырэнне сусвету. Ты быў патрэбен вясне.
Зоркі маглі спадзявацца, што іх адчуваеш.
Часам з мінулага хваля ўздымалася грозна,
і, як праходзіў пад вокнамі, насцеж адкрытымі, ты —
скрыпка табе аддавалася. У гэтым быў заклік.
Ты адгукнуўся? Не! Надта няўважлівы быў
ты ад чакання, якое табе прадвяшчала
блізкасць каханай. (Куды ты схаваў бы яе,
ў час, калі ўзнёслыя думкі ў дом твой прыходзяць
і застаюцца ў ім нанач з табою сам-насам?!)
Трэба спяваць пра каханне, калі ты сумуеш бясконца,
бо і да сёння яно яшчэ не бессмяротнае.
Нават пакінутым часта зайздросціў: яны
любяць мацней, чым абранцы шчаслівай паталі.
Зноў услаўляй і ўслаўляй бясконца, бязмерна;
помні: герой бессмяротны, і нават пагібель яго —
толькі нагода, каб зноў нарадзіцца, каб нанава жыць.
А закаханых ва ўлонне прымае прырода
стомленая, нібы сілы ўжо ёй не стае
зноў нараджаць іх. Падумай пра Гаспару Стампу,—
чыстая гэта дзяўчына за прыклад абрала
кінутую і, натхнёная вобразам страсці,
марыла быць, як яна. Ці спрадвечны боль
зробіць нас плоднейшымі? Мо пара нам любоўна
вызваліцца ад кахання, нарэшце, яму
супрацьстаіць, падобна таму, як страла
супрацьстаіць цеціве, да ўпору напятай,—
раптам адпушчаная, яна робіцца нечым
большым, чым ёсць яна, бо ёй супыну няма.

Кліч галасоў. Услухоўвайся ў іх, маё сэрца,
так, як святыя толькі ўслухоўвацца ўмелі:
покліч магутны іх адрываў ад зямлі,

ўкленчаных у малітоўным экстазе,—
і не заўважыўшы гэтага, слухалі моўчкі яны.
Божага голасу вытрываць, сэрца, не зможаш.
Хай бы паслухала, сэрца, хоць веянне весткі,
весткі нясцыннай, утворанай з цішы пякельнай.
Сёння табе гэту вестку мёртвыя шэпчуць,
тыя, што замаладзь у цішыню адышлі.
Можа, лёс іх спакойна гаворыць з табою,
калі ты заходзіш у храмы Неапаля, Рыма.
Ці не азваўся табе надмагільны граніт
надпісам гордым у Santa Maria Formosa?
Чым жа я ўзычу? Хочуць, каб ціха я зняў
з іх занядбання пячаць, бо яна замыкае
душы памерлых у лёгкім і чыстым іх руху.

Праўда, нам дзіўна зямлю пакідаць і не жыць,
больш нашых звычаяў нудных ужо не трымацца,
ў ружах і ў іншым усім, што нечым нас вабіць,
болей не бачыць значэння, істотнага для чалавека,
рукі забыць, што трывожна нас песцілі калісь,
кінуць імя сваё, нібы разбітую цацку.
Дзіўна — зямлю назаўсёды пакінуць, не марыць.
Дзіўна — угледзець, як тое, што важным было,
пырхае лёгка ў прасторы і вольна лунае.
Смерць нам спачатку таксама дзіўнай здаецца.
Звыкнуцца трэба, пакуль спакваля не пачнеш
вечнасць нутром адчуваць.— Памыляюцца толькі
жывыя, калі яны вельмі выразна, дакладна
смерць ад жыцця адасобіць спрабуюць.
Кажуць, анёлы часам і самі не знаюць,
ці да жывых, ці да мёртвых прыходзяць яны.
Вечная плынь абмывае абодва царствы
і паглынае ў абодвух усе пакаленні.

Мы не патрэбны анёлам, адорвені прахлыя
ад маладога жыцця; ад зямнога адвыкнуць

можна — нібы ад грудзей мацярынскіх дзіця.
Мы, каго тайны вялікія вабяць адвечна,
мы, каму скруха духоўна расці пасабляе,—
продкаў памерлых забыўшы, *ці пражывём?*
Кажа легенда, што галашэнне па Ліну
моўчу здранцвелую музыкай калісь прарвала:
у баязлівай прасторы, адкуль назаўсёды
юны паўбог адышоў, пустата загучала
тым, што нас цешыць і вабіць, што нам памагае.

ДРУГАЯ ЭЛЕГІЯ

Кожны анёл — жахлівы. І ўсё-такі — гора мне! —
Вас апяваю, амаль што загубныя птушкі душы,
знаючы вас. Куды ж дзеліся Товія дні —
калі Прамяністы стаяў на парозе пакуты,
нібы вандроўнік, адзеты ў дарогу, не страшны;
(хлопец да хлопца — прыглядваўся кожны
цікаўна).
О, каб цяпер той архангел, што там, за свяцілам і,
грозна наблізіўся хоць на імгненне да нас,
сэрца разбілася б наша адразу. Дык хто ж вы?

Рана пашчасціла вам, мілаванцам стварэння.
Вы — гэта гор вышыня, небакраі дасвецця,
дробны пылок бажаства, што цвісці пачынае,
троны, ступені, праходы, суставы святла,
сутнасці вечнай начынне і сумятня асалоды,
выбухі бурныя шалу, пачуццяў чароўных,
люстры, якія з сябе хараство сваё льюць
і — узнаўляюць яго ў абліччы сваім.

Бо, адчуваючы,— робім усё пра-мінулым,
бо, уздыхаючы,— мы выдыхаем сябе,
бо, палымнеючы,— мы ад успышкі да ўспышкі

тлеем слабей і слабей. Няхай нехта нам скажа:
ты ўваходзіш у кроў маю, ласку, вясну,
ты напаўняеш сабою прадмет... Не ўтрымае
нас ён, калі мы знікаем бясследна ў ім.
Хто ж утрымае прыгожых! Няспынна іх твар
бляскам уяўным азораны — гасне адразу.
З нас яно — Наша знікае, як з лісця раса,
мы астываем, нібыта гарачая страва...
А наша ўсмешка? — куды знікае яна?
А нашы новыя, палкага сэрца парывы?..
Гора! Мы ў гэтым *жывём*. Хіба, можа, сусвет,
у якім мы растворымся, мае наш прысмак?
Можа, анёлы ўспрымаюць толькі сваё,
тое, што выпраменьваюць самі, а можа,
ім дастаюцца часцінкі ад сутнасці нашай?
Можа, упісаны мы
ў рысы іх так, як няпэўнасць — хай нават
не часта —
ўпісана ў рысы аблічча цяжарнай жанчыны?
У пастаянным вяртанні ў сябе яны могуць
гэтага нават не бачыць. (Хоць бачыць павінны.)

Ноччу маглі б закаханыя — толькі б умелі —
дзіўныя дзівы расказваць адно аднаму,
бо ахінае іх вечная тайна, маўчанне.
Дрэвы нямыя, дамы, у якіх мы жывём,—
ўсё непарушна *стаіць*. Толькі мы абцякаем
гэта, як продзімень пругкага ветру прадметы.
Зладжана ўсё нас замоўчвае, з сорамам часам,
часам з надзеяй маўкліваю верачы ў нас.

Вас, закаханых, шчаслівых у шчырай любові,
я заклікаю нас зразумець. Вы з'яднаны.
Што вам вядома пра нас? Раскажыце спакойна.
Вось падымаюцца рукі мае, і ў іх тоне
стомлены твар мой. І гэта дае мне пачуцці.

Толькі ж ці досыць іх? Ці дастаткова,
каб *існаваць?*
У вас, хто жыве ў захапленні другога, пакуль
не задаволіць палкіх жаданняў пакорай:
болей не трэба, даволі! — у вас, што ад ласкі,
як вінаградныя гронкі, налітыя сонцам,
у вас, хто альбо паміpae, альбо
перамагае ў любві,— пра лёс наш пытаюся.
Ведаю: ваша крананне таму нам прыемнае,
што не знікае месца, якое пяшчотна
вы закранулі — у гэтым вы можаце мецъ
чыстую вашу трываласць, надзею на шчасце,
вечнае шчасце ў абдымках. І ўсё ж, калі зможаце
вытрымаць: позірку жах і любоўную муку
там пад акном, вашу *першую* ў садзе прагулку,—
ці збераджэцца каханне? Ці вы — гэта вы?
Бо, як абое прыннікнеце вуснамі п вуснам
і неспатольна п'яце адно аднаго —
дзіўна, калі адмаўляецца піць адзін з вас.

Ці не здзіўляе вас часам ашчадлівасць жэстаў
на барэльефах антычных? Няўжо старажытным
клаліся лёгка на плечы каханне, разлука —
нібыта створаны з іншых субстанцый яны?
Рукі бязважкія ўспомніце і параўнайце
з сілай магутнай, якая закладзена ў торсы.
Тыя — умелі валодаць сабою і ведалі межы.
Так дакранацца нам трэба таксама; мацней
толькі багі дакранаюцца. Гэта — іх воля.
Каб жа знайсці нам маленькае чыстае поле
чыста Людскога, шнурочак зямелькі ўрадлівай
паміж патокам і скаламі. Нас наша сэрца
перапаўняе, як *тых,* даўнейшых, людзей;
мы прасачыць
сэрца не можам ні ў вобразах, што яго песцяць,
ні ў боскіх целах, дзе стрымана б'ецца яно.

ТРЭЦЯЯ ЭЛЕГІЯ

Адно — узнёсла співаць пра каханне. Другое,
о гора! —
пра вінаватага бога рачнога ў крыві.
Хлопец, якога дзяўчына чакае,— не знае яшчэ
пра ўладара асалоды, які на самоце
перш чым насыціцца ласкай дзявочай, альбо
часта, не маючы ласкі, ўздымае боскую голаў
і непазнанасцю плешча, запальвае бунт уначы.
О Нептун у крыві, о трызубец жахлівы яго!
О цёмны вецер дыхання, што з тайных ракавін дзьме!
Чуеш, глыбее, згушчаецца цёмная ноч. Яе зоркі —
ці не ад вас ідзе бурная радасць каханка, які
промні каханай угледзеў? Ці чыстая вера яго
у чысціню яе твару народжана не чысцінёю зорак?

Толькі, на жаль, ані ты, ані родная маці
лук яго броваў не напялі для такога чакання.
Не на табе, о каханая, не, і не дзеля цябе
пружацца губы яго цецівою жахлівай.
Думае, можа, што ўразілі моцна яго
лёгкія крокі твае, што сама ты — як золкавы ветрык?
Хай ты спалохала сэрца, і толькі — а страхі,
страхі старыя жылі ў юнаку і прачнуліся раптам.
Клікні яго... ты не выклічаш з цёмнага кола нічога,
хоць ён і *хоча*, і прагне, і лёгка прывыкне
да патаемнага сэрца твайго і пачнецца ў ім.
Ці ён папраўдзе ў сэрцы пачаўся?
Маці, *ты* — гэта тая, якая яго пачала;
новы ён быў у табе, над вачмі яго новымі ты
дружны схіліла сусвет, ад чужога яго засланіла.
Ах, дзе ж тыя гады, калі статная постаць твая
расхваляваны хаос ад яго адхіляла?
Многае ўтойваеш ты: страхі начныя пакояў
ператварыла ў бяскрыўднасць, у схованках сэрца

перамяшала прастор знелюдзелы з прасторaю ночы.
Не ў цемру, о не, у тваю
найбліжэйшую бытнасць паставіла светач начны,
і ад прыязнасці шчырай к табе — ён заззяў.
Кожны шолах магла ты з усмешкай пазнаць,
растлумачыць,
быццам ты ведала, як і *калі* скрыпне ў сенцах
падлога...
Слухаў ён і лагаднеў. Улагоджваць магла
ты, калі ціха ўставала; з-за шафы выходзіў
лёс высачэзны яго; захінуўшыся ў складкі
злёгку рассунутай цяжкай заслоны, к табе
будучыня неспакойна-бунтоўная з мораку йшла.
Сам жа ён, супакоены, ціха ляжаў
пад дрымотнымі вейкамі лёгкага твару твайго,
асалоду смакуючы, і прадчуваў засынанне...
адчуваў ахаваным сябе... А *ўнутрана* — хто,
хто ахаваў яго ад наплывання зачыну?
Гэта *была* неабачнасць заснулага; ў сне
марыў і сніў, і жыў ён у соннай гарачцы:
Ён — гэты Новы, Трывожны, аблытаны быў
доўгімі вусамі ўнутранага выспявання,
быў ён аплецены ўзорамі, што зацiскалі
зрослаю формаў звярыных, цялесных.
Ён ім аддаўся. Ён палюбіў.
Ён палюбіў сваё ўнутранае, тыя дзікія нетры,
тую Пра-пушчу ў сабе, дзе на глухіх трухлявішчах
стала сэрца яго прамяніста-зялёнае. Ён палюбіў.
Але пакінуў усё і карэннем глыбока пайшоў
у магутны пачатак, дзе нараджэнне малое яго
ўжо адбылося. Улюбёна сышоў да сваёй пра-крыві,
быццам у бездань, дзе жах затаіўся, продкамі сыты.
І ўсё Страшнае знала яго і шматзначна маргала.
Гэта Жахлівае ўсмешкай вітала... Не часта
так усміхалася ты яму, маці, пяшчотна.
Як жа не мог гэта ўсё ён душой не любіць,

як жа не мог не любіць ён усмешкі! *Раней* за любоў
да цябе ён адчуў любоў гэту, якая ў той час,
калі ты насіла яго,
ў лоне таілася, ў водах, жыццеўтрымальных для
плода.
Бачыш — кахаем не гэтак, як кветкі кахаюць,
што толькі раз зацвітаюць у год; нам любоў
жыццядайны сок улівае ў гарачую плоць.
О дзяўчына, кахаем у нас не Адно, і не толькі
Будучыню, а бязмернасць кіпення; не толькі Дзіця,
а найперш тых Бацькоў, што ўрошчаны ў нашыя
сэрцы,
быццам абваліны гор; а найперш перасохлае рэчышча
даўніх-былых Мацярок; а найперш краявід
над захмаранай альбо бясхмарнаю доляй; —
вось што, дзяўчына, было да цябе.
А ты сама, што ты знаеш сама, ты, што змагла
выклікаць з любага ўсё папярэдняе?
Колькі пачуццяў
выйсці на свет з прамінулых ужо існаванняў змаглі?
Колькі жанок цябе ненавідзяць?
Колькі пахмурных мужчын разбудзіла ў крыві юначай?
Дзеці памерлыя любяць цябе... О ціха, о ціха,
мілая, нешта зрабі для яго,— павядзі
любага па садах, падары яму змроку начнога
празмернасць...
Каханнем яго ўтрымай...

ЧАЦВЕРТАЯ ЭЛЕГІЯ

О дрэвы жыццяў, колькі да зімы вам?
Мы раз'яднаны. Мы не птушкі пера-
лётныя. Мы вельмі позна кідаем
сябе на вецер, падаем пасля
на роўнядзь сажалкі бязвольна.

Мы і цвіцём і вянем аднадчасна.
А недзе львы жывуць і пра бяссілле,
пакуль магутныя, не хочуць ведаць.

А мы павінны, прагнучы з'яднання,
даніну ўсім плаціць. Варожасць нам
бліжэй. Бо закаханыя — і тыя
ў любові межы знаюць, хоць прасторы,
свабодных лоаў і радзімы прагнуць.

Эскіз імгнення звыкла мы ўспрымаем
на фоне процілегласцяў і цяжка
нам бачыць гэта; бо тут ясна ўсё.
Бо мы абрысаў пачуцця не бачым,
а толькі абалонку фармавання.


Хто не сядзеў перад заслонай сэрца,
нібы ў тэатры, баязліва, ціха:
і дэкарацыяй была разлука!
Няцяжка зразумець. Знаёмы сад,
павевы ветру, малады танцоўшчык.
Не *той*. Даволі. Грым — не дапаможа,
пераадзетага пазнаеш мешчаніна,
які ў жытло праз чорны ход ідзе.

Што маска гэтая пустая! Лепш! —
мне лялька. Бо напоўнена яна.
Прыемней бачыць мне марыянетку,
і ніткі, і трысцё ў руках актора
альбо ў маіх. Я тут, я перад сцэнай.
Хай тухнуць рампы і няхай мне скажуць:
«Усё, закончана», няхай на сцэну
пустэча выйдзе шэрым скразняком —
няхай мяне самотнага пакінуць
мае нямыя прашчуры, жанчына
і нават любы вірлавокі хлопчык —
я застаюся на спектаклі, тут.

Няпраўда? Ты, хто праз мяне зазнаў
жыццёвай горычы, мой бацька, ты,
хто ў мой пагляд дапытліва ўзіраўся,
хто піў настой павіннасцей маіх,
пакуль я рос і прыйшласць смакаваў,
ты, бацька мёртвы той, хто гэтак часта
сярод надзей маіх лунаў трывожна,
хто кожны міг адмовіцца гатовы
ад абыякавасці — скарбу мёртвых,
дзеля крупінкі лепшай долі сыну,—
скажы: ці праўда? І скажыце вы,
хто мне дарыў сваю любоў заўсёды,
каго і я пачаў любіць патроху,
хоць забываў пасля, бо ў вашых тварах
мне пачынала бачыцца прастора,
сусветная прастора, у якой
ужо не бачыў вас... І я чакаю
на лялечным памосце дзеі...
Не, не чакаю — прагну ўбачыць,
бо, каб увагу пільную спатоліць,
між лялек выйдзе неўзабаве сам
анёл і выступіць жывым акторам.
Відовішча! — анёл і лялькі разам!
Тады і ўключыць, можа, ён усё,
што разлучае нас, у кругаверць
падзей і змен і падначаліць там
сабе ўсе поры года — і анёл
пачне ігру сваю паказваць нам.
Нябожчыкі павінны ведаць, што
людскія справы — кволая зачэпка
для ўчынкаў больш высокіх. Бо нічога
тут першароднага няма. Дзяцінства,
калі за рэчамі яшчэ было
штось большае, чым проста час мінулы,
а будучыні й знаку не было,
калі мы ўсе стараліся расці



Рыльке, 1906 г.



Пабла Пікаса, «Вандроўныя акрабаты», 1905 г.
Па матывах карціны напісана пятая
«Дуіненская элегія».

на ўцеху тым, хто, апрача сваёй
даросласці, нічога больш не мае,—
о вы, дзяцінства шчасныя гадзіны!
Тады ў сваім самотным руху мы,
здаволеныя цалкам існаваннем,
стаялі паміж цацкаю і светам,
на месцы тым, якое ад пачатку
адведзена для чыстых парыванняў.

А хто пакажа, дзе стаяць дзіцяці?
Хто паміж зор яго паставіць, хто
яго руцэ адлегласці даверыць?
Хто вылепіць дзіцяці з хлеба смерць?
Хто ў пухлы роцік зерне пакладзе
з атручанага яблыка?.. Забойцу
не цяжка зразумець. А смерць, яе,
пранесеную *праз* жыццё ў сабе
лагодна, ўсцешана,— і гэтай смерці
не апісаць...

ПЯТАЯ ЭЛЕГІЯ

Прысвячаецца пані Херце Кёніг

Хто ж яны *тыя,* скажы, вандроўнікі; можа,
гнаныя доляй уцекачы болей, чым мы,
мы, каго выгнала на дасвецці
невядома *каму* на пацеху
вечна галодная і ненасытная злая сваволя.
Іх яна гоніць, круціць, трасе, нагінае,
кідае ўгору, хапае; і зноў як па масле
з гладкіх вышыняў па гладкім паветры ўніз апускае
на падасланы пад ногі старэнькі дыван,
мяккую латку ў сусвеце,

пластыр на целе прасторы
там, дзе ваколіцы неба
ранамі ўкрылі зямлю.
Апускаюцца і —
пругка на ногі ўстаюць і падобныя ўжо
на вялікія літары ў тэксце... І дужых мужчын
схопяць жартам і звычнаю хваткаю скруцяць,
быццам Аўгуст Дужы, што мог за сталом
нехаця пальцамі міску скруціць.

Ах, вакол гэтага цэнтра
ружа цвіце, захаплення ружа,
і ападае пялёсткамі.
А пад сэрцам
песціка самаапыленага
завязь уяўная марна расце, неахвотна — яна
неўсвядомлена свеціцца праз абалонку
ўяўна смяшлівай сваёй неахвоты.

Гэты:
маршчыністы, горкі мацак;
толькі ляскоча, стары, у занадта прасторнай
сваёй абалоне, быццам у ёй спачатку
двое былі, адзін з якіх у магіле,
другім перажыты,
другім, хто аглух і здурнеў
у аўдавелай скуры сваёй.

Гэты:
малайцаваты, нібы нарадзіўся
ад скруціваза й манашкі; туга набіты
мускуламі і прастадушнасцю.

О вы, хто падораны быў замест цацкі
недаспелай пакуце, калі
спакваля ўбіралася ў сілу яна...

Ты, хто, як плод,
зеляпан, сотні разоў штодня
падаеш з дрэва разам пачатага руху (які
шпарчэй за ваду працячэ праз вясну, і праз лета,
і восень),—
падаеш ты, гупаеш аб дамавіну;
часам нешта ўзнікае ў табе, як аблічча,
рэдка калі павернутае да тваёй
маці, любімай табою так моцна, ды ў целе
гладкім тваім палахліва знікае,
ледзьве акрэсленае аблічча... І зноў,
пляскае зноў у далоні мужчына — Ап! —
знак да скачка даючы, і перад тым,
як абвострыцца боль каля сэрца,
што нясецца галопам заўсёды,— адчуецца
ў пятах пранізліва-востры агонь,
і прыпячэ ён раней за прычыну
слёз на вачах,
плоцкіх слязінак знямогі й адчаю...
І ўсё ж — хай натужна, праз сілу —
усмешка...

Анёле!
Сарві гэту ўсмешку, як каліўца з кветкай,
і апусці яе ў вазу разам з усімі
радасцямі, не спазнанымі намі *дагэтуль*,
і ўвекавеч іх, на урне пакінуўшы надпіс,
горды, прыгожы і ўзнёслы *«Subrisio Saltat»*.

Ты, дарагая,
праз цябе пераскоквае радасць,
найвялікшая радасць. Магчыма, валаны
цешацца шчасцем сваім і тваім —
альбо на дзявочых
пругкіх грудзях металічны зялёны шоўк
болей нічога не хоча, здаволены целам.

Ты парушаеш заўжды раўнавагу,
як яблык на рынку,
кінуты рэзка на шалю перад усімі,
голая аж да плячэй.

Дзе ж яно, месца,— яно ў маім сэрцы,—
дзе яны *не маглі,* дзе яны
адпадаліся, быццам жывёлы,
злучаныя паняволі,
але не здольныя зліцца,
дзе занадта вялікі цяжар,
дзе няўпэўнена круцяцца
на паднятых трысцінах
няўстойлівыя талеркі...

І раптам у гэтым цяжка здабытым Нідзе, раптам
невыказнае месца, ў якім найчысцейшая драбната
неверагодна змяняецца і пераходзіць
у паражнечу надмернасці,
дзе рахунак шматлічбавы
незлічона расце.

Плошчы, о плошчы Парыжа, арэна без межаў,
дзе мадыстка *madam Lamort*
трывожныя сцежкі зямлі, бясконцыя стужкі
пераплятае і вяжа і нанава творыць з іх
банты, фестоны, фальбоны і кветкі, плады
штучнай флоры,
барвы фальшывыя — дзеля аздобы
шапачак зімніх Нядолі.

. . . .

Анёле! Пакажы тое месца, яшчэ не вядомае нам,
дзе закаханыя, стаўшы на дыване небывалым,
паказалі б нам тое, чаго
тут паказаць не могуць,— бясстрашнасць
фігур і палёту іх сэрцаў,

вежы прынадных уцех і драбіны, адна на адну
абапёртыя там, дзе няма ім апоры,—
тут бы *адважыліся* сярод тлуму
знямоглых, маўклівых нябожчыкаў-гледачоў,—
ці кінулі б гэтыя мёртвыя людзі свае дбайна
сабраныя,
пільна, ашчадна хаваныя,
вечна патрэбныя, вечна апошнія
грошыкі шчасця вось гэтай
усмешлівай пары
на іх прыціхлы
дыван?

ШОСТАЯ ЭЛЕГІЯ

О смакоўніца, важна мне ведаць здаўна,
як ты свой цвет у завязь ператвараеш,
як у гатовы к даспеласці плод на галіне
ўкладваеш чыстую тайну сваю некрыкліва.
Нібы па трубах фантанаў, па гнуткіх галінах
сокі імкнуцца і ўніз, і ўгару і са сну
пырскаюць шчасцем свайго найсалодшага твора.
Так, як у лебедзя бог...
. . . . Мы ж марудзім —
не хочам буяна цвісці і ў запознены плод,
у нераспеласць яго мы вінавата ўваходзім.
Рэдка хто здольны нястрымна імкнуцца да дзей,
каб загарэцца адразу на поўнае сэрца
ў час, калі прага цвіцення, як ветрык начны,
вейкі кранае і вуснаў бутон абуджае:
можа, героям ці тым, што заўчасна памруць,
жылы круціць іначай садоўніка смерць.
Мчацца яны стрымгалоў: апярэджваюць самі
ўсмешку сваю, як запрэжка на фрэсках Карнака
апярэджвае пераможцу-цара.

Дзіўна блізкі герой да заўчасна памерлых.
Барацьбы за сваю працягласць у свеце
ён не баіцца. Жыве ён — угору йдучы,
у пераменлівы светапарадак, у зоры
вечнай, як свет, небяспекі. Нямногія знойдуць
там яго. Але разбуджаны Лёс, той, які
змрочна замоўчвае нас, апяваць яго будзе
ветрам парыўным свайго распумелага свету.
Толькі *яго* гэтак чую. І праз мяне
з ветрам струменіць прыцемнены голас яго.
Як бы хацеў я ад смутку схавацца: каб быць
хлопчыкам — о, каб магчыма было ім зрабіцца —
сесці, падперціся будучымі рукамі
і прачытаць пра Самсона, пра тое, як колісь
маці спачатку нічога радзіць не магла —
потым усё нарадзіла.

Ці ж ён не быў у табе ўжо героем, о маці,
ці ж ён не ў лоне зрабіў свой уладніцкі выбар?
Тысячы ў лоне спелі, каб выспець, як *ён*,
ды паглядзі: толькі ён адзін з тысячаў многіх
змог дасягнуць, і абраць, і рашыць, і стаць.
Рушыў калоны таму, што ён вырвацца здолеў
з цеснага змроку цела твайго да свету,
дзе выбіраць мог і йсці па шляху станаўлення.
Маці герояў, крыніцы патокаў, кіпучых патокаў!
Вы — гэта бездані тыя, куды з кручаў сэрца,
войкнуўшы, кідаліся маладыя дзяўчаты,
будучых вашых сыноў і ўнукаў — ахвяры.

Бо калі прарываўся герой праз завалы кахання,
кожным ударам імпэтнага сэрца гнаны,
ён, адвярнуўшыся, ўжо над абрывам усмешкі,—
быў зусім іншы.

СЁМАЯ ЭЛЕГІЯ

Гэта не покліч, не позва, а голас-назад —
сутнасць у крыку тваім, хоць крычаў ты, нібы
птах напрадвесні, забыўшы, што ён —
толькі гаротная кволая птушка, і толькі,
а не суцэльнае сэрца, якое цела
ў неба душэўнае ўзносіць. І ты, нібы птах,
клікаў бы, можа, каханую так, каб здалёку,
нават не ўбачыўшы мілага, голас пазнала,
так, каб прачнулася раптам у сэрцы яе
позва к табе, абагрэтая клічам пачутым,—
так, каб на кліч твой страсцю ўзгарэлася самка.

І зразумела б вясна — што няма тут месца,
дзе не гучала б прадвесце любві. А спачатку
слабы твой кліч, запрашальны, ў адказ на які
цішай гнятлівай, сцвярджальнай прамоўчвае дзень.
Потым угору прыступкамі гэтага клічу
ў будучыню, у прывідны храм! А там песні,
пыpскі фантанаў; а там іх чакае
у гульні-абяцанцы падзення шматрадасны гімн,
пырснуты промень-струмень. А тады — прыйдзе лета.

Нават не раніцы летнія, нават не золкі,
што праясняюцца, каб абярнуцца днямі.
Нават не летнія дні, што распешчваюць кветкі
і дрэвам уладу, магутную веліч даюць.
Нават не любасць да сіл, што раскрыліся летам,
і не шляхі, і не толькі лугі на змярканні,
нават не светлы павеў пасля буры вячэрняй,
нават не сну наближэнне, не толькі цьмяныя мары...
Перш за ўсё ночы! Глыбокія летнія ночы.
Перш за ўсё зоркі! Высокія зоркі зямныя.
О, каб у смерці дазнацца, што безліч — іх лік,
лік гэтых зорак: ну як жа, ну як жа забыць іх!

Чуеш, я клічу каханую. Толькі прыйсці
хоча *яна* не адна... Са сваіх аслабелых магіл
з ёю прыйшлі б і дзяўчаты... А як абмяжую
кліч той прызыўны? Зямлю, як раней, тапельцы
клічуць, шукаюць... О дзеці, зямную рэч
узяўшы, ўзялі вы бясконцую безліч рэчаў.
Лічыце, пэўна, што лёс — згустак дзяцінства?
Часта вы абганялі каханых, калі
беглі кудысьці шчасліва ў прастору — куды?

Жыць на зямлі — гэта велічна! Знали, дзяўчаты,
вы гэта добра заўсёды, знали і *тыя*,
што апускаліся ў крыўдзе балючай на дно
ў гулкія вуліцы горада, у гнаявішчы —
кожная з вас мела шчасця гадзіну, няхай
і не гадзіну — а толькі прамежак у часе,
тыя імгненні, калі цалкам валодаеш светам.
Жылы пульсуюць жыццём. О жыццё!
Як лёгка мы забываем усё, што суседзі
ўсмешкай зайздроснай не ўхваляць ніколі. Нам трэба
яўнае і паўнаважкае; яўнае шчасце
дадзена зведаць ва ўнутранымператварэнні.

Свет — толькі ў нас, у каханні стваральным нашым.
Ператварэнне — вось наша няспыннасць жыцця.
Там, дзе калісьці ўзвышаўся рэальны дом,
бачыцца сёння прыдуманы вобраз, які
нібы ў мозгу застыў без перамен аніякіх.
Сховішчы моцы будуе сабе дух часу
бясформнаю сілай, якую ён чэрпае скрозь.
Ён жа не знае святынь. Мы, спажываючы сэрца,
нешта ашчадна збіраем. І кожная рэч,
намі здабытая просьбамі, мольбамі, прагне
цалкам з Нябачным самкнуцца. А большасць падзей
гэтага бачыць не могуць, не могуць яны
гонкі з калонамі храм збудаваць *у сабе*.

Колькі бяздольных такіх у выкрутах свету!
Будучыня і мінулае ім не належаць.
Нават наступнае цяжка здабыць чалавеку.
Хай гэта *нас* не бянтэжыць, хай моц набірае
вобраз спазнаны. *Стаяў* ён не раз паміж намі,
ў цэнтры знішчальнага лёсу, у гушчы людской,
у абыякавасці і гарнуў да сябе
зоркі з бяспечнага неба. Анёле, *табе*
тут гэта я пакажу. У паглядзе тваім
хай ратаванаю стройнасцю ён узнясецца.
Сцены, калоны, упоры, аркады і сфінкс
у занялалым паселішчы — велічны храм.

Хіба ж не цуд? І яго — *мы* зрабілі, анёле.
Вызнай, вялікі, што здольныя мы на такое —
і на хвалу мне дыхання не хопіць. Не марна,
значыць, імкнёмся ў прасторы, у *нашы*
прасторы.
(Веліч якая ў іх ёсць! Бо за тысячы год
іх перапоўніць пачуццямі мы не маглі.)
Вежа высокая, праўда, анёле? І нават
у параўнанні з табою высокай была,
Шартр быў таксама вялікі.
Музыка ж толькі — вышэй за яго і за нас.
А каханая... ноччу, адна перад цёмным акном...
кволая ў бездапаможнасці горкай.
Не думай,
быццам, анёле, я клічу цябе! Ты ж не прыйдзеш.
Заклік гучыць мой, як — прэч! але супроць
патоку,
не, ты не пойдзеш. Мой заклік падобны руцэ,
ўрачыста паднятай. Далонь, якая
гатова схапіць, о Недасягальны,
будзе заўсёды адкрыта табе,
як асцярога, як абарона.
Вось яна...

ВОСЬМАЯ ЭЛЕГІЯ

Прысвячаецца Рудальфу Каснеру

Адкрытымі вачамі цэлы свет
стварэнне бачыць. Вочы ў нас,
наадварот, на ўсе бакі
расстаўлены, нібыта пасткі
навокал выхадаў на волю.
Што звонку *ёсць,* мы пазнаём
з аблічча ўсіх жывёл; змалку мы яшчэ
дзяцей няволім, навучыўшы іх
усе прадметы бачыць дагары,
а не адкрыты свет, які ў звяроў
на іх абліччах гэтакі глыбокі.
Не мае смерці свет.
Бо толькі мы
смерць бачым; а свабодны звер
сваю пагібель мае за сабою,
наперадзе ж ён бачыць бога. Хай
ідзе у вечнасць тое, што ідзе,
як рэкі, як крыніцы, як патокі.

У *нас* няма нідзе такога дня,
каб адкрываў нам чыстую прастору,
дзе кветкі скрозь і скрозь раслі б.
Заўсёды свет такі: у ім нідзе нічога
няма — каб без нічога; чысціні
нябачнай, поўнай подыху, каб *знала*
усё бясконца; знаючы ж усё,
каб *не жадала.*
Так дзіця
у гульнях забывае ўсё, пакуль
сабой не зробіцца, калі памрэ.
Хто блізкі смерці — той яе не бачыць,
бо пазірае *ўбок* вачамі звера.

О закаханыя! Калі б яны
адно другому светлы далягляд
не засцілі, напэўна, што змаглі б
даўмецца, поўныя здзіўлення...
Ці памылкова, выпадкова, ім
прастор адчынены не ўсім адразу...
Але ніхто пераступіць мяжы
свае не можа; кожны з іх таму
сваім зноў светам робіцца памалу.
А мы, ўзіраючыся ў акт стварэння,
мы толькі бачым гэты свет заўжды
бязмежнасці адбіткам, на які
смуга дыхання нашага асела.
Або здаецца нам, што звер, нямы,
спакойным позіркам сваім наскрозь
нас працінае. Вось які ён — лёс:
стаіць насупраць, і нішто яго
не ўражвае; вось так і чалавек,
і толькі так, насупраць ён заўсёды.

Калі б ён нашую свядомасць меў,
той звер, што ўпэўнена ідзе на нас
ці ў іншы бок,— ён нас бы павярнуў
на свой, звярыны, шлях. Аднак яго
быццё бясконца неабдымнае, і нам
не зразумець яго, не зразумець
яго тугой не стомлены пагляд.
І там, дзе будучыню бачым мы,
Усё ён бачыць, а ва Ўсім —
сябе суцэльнага заўсёды.

О шчасце тых *малых* істот,
што *застаюцца* ў мацярынскім лоне;
о шчасце мухі, той, што ў шлюбны час
ляціць сама *ў сябе:* ёй лона — Усё.
Упэўненасць няпоўную згадай

у птушкі, што дваістасць знае
свайго паходжання, нібы яна —
душа этруска мёртвага, які
ў прастор прыняты, дзе ягоны дах —
спакойныя фігуры. О, як той
бянтэжыцца, хто робіць свой палёт,
прарваўшы лона! О, як страшна ён
сябе баіцца, рэжучы паветра!
Яго палёт, як трэшчына на вазе.
Так кажана нябачны воку след
фарфор вячэрні неба працінае.

І мы: заўсёды, ўсюды — гледачы,
ўсё бачым, выйсця ж нам нідзе няма!
Мы поўныя праз край! Мы робім лад.
Лад рушыцца! Мы ладзім зноў яго
і распадаемся паволі самі.

Хто павярнуў нас так, што мы
заўжды супроць таго, хто выйсце мае?
А ён выходзіць на апошні свой курган,
адкуль відзён былы абсяг жыцця,
ён спыніцца ў задуме, азірнецца...
Мы ўсе жывём
у вечным развітанні.

ДЗЕВЯТАЯ ЭЛЕГІЯ

Навошта, калі падаспела нарэшце пара
тэрмін жыццёвы адбыць, нібы лаўр, чыя зелень —
самая цёмная зелень, чый кожны лісточак
хвалісты па беражках (як усмешка ветру),—
навошта тады чалавечнасць? Навошта, ад долі
адрокшыся, прагнуць яе?

О, *не* дзеля шчасця —
загадзя пасмакаваць сваю блізкую страту —
і не з цікаўнасці да выпрабоўвання сэрца —
здолеў *бы* гэта і лаўр. . . . .

Не, а таму, што Зямное важней, і ў нас
мае патрэбу Зямное — няхай крыху хісткае.
Нам, самым хісткім, яно сама *раз*. Адзін *раз*.
Толькі ўсяго адзін *раз*. *Раз* і не болей.
Раз гэты, толькі адзін,
раз быць *зямным* існаваннем —
гэта, здаецца, і ёсць непаўторнасць, канечнасць.

Гэтага прагнем усе! Толькі б дабіцца!
Толькі б здабытак у простых руках утрымаць,
у перапоўненым позірку, ў сэрцы маўклівым!
Хочам Зямнымі быць.
Каму перадаць гэта потым?
Лепш захаваць назаўсёды сабе... На той свет
што з сабой возьмеш? Не возьмеш Убачанасць,
добра спазнаную тут, і мінулых падзей.
Значыць, адны толькі болі, спазнаныя лепш,
і даўгачасны свой вопыт кахання. I ўсё...
Толькі ўсяго, *невымоўнае* толькі.
Што з гэтым зробіш
там, сярод зорак? А зоркі найбольш невымоўныя.
З гор у даліну вандроўнік не будзе прыносіць
жменю зямлі невымоўнай, а чыстае слова,
цяжка здабытае там, і гарычкі сцяблiну
з жоўта-сіняю кветкай. Мы, пэўна, жывём
тут, каб казаць чыста: «дрэва, дом, студня, акно».
Самае большае: «вежа, калона». *Казаць.*
О, *так* казаць, каб падказваць сутнасць, схаваную
ў рэчах самім гэтым рэчам. Хітрые зямля
моўчкі, калі падбівае ўсіх закаханых
жарам страсцей сваіх іншых паліць?

Вось парог — абаім закаханым
пераступіць іх уласны парог,
тымі стаптаны, якія ішлі,
і тымі, што прыйдуць...,
як гэта лёгка.

Тут цяпер час для *Вымоўнага,* тут яго дом.
Выкажся і прызнай. Тут хутчэй, чым дзе-небудзь
тыя адкрышацца рэчы, што пераўжыты,
іх безаблічная дзейнасць тут выштурхне, зменіць.
Лопне яе абалона, і вырасце дзея
проста з сярэдзіны і абмяжуе сябе.
Сэрца між молатаў наша
ляжыць, як язык
за зубамі, але і тады
славіць нястомна.

Свет услаўляй перад анёлам, не свет невымоўны,
не фанабэрся сваім пачуццём велізарным.
Бо ў тым сусвеце, дзе адчуваюць пачуцці,
ты — немаўля. Лепш раскажы там анёлу
простае нешта, што з роду ў род перадаецца,
наша спрадвеку — даткніся рукою да зор.
Выкажы рэчы яму.
І ён здзіўлена стане,
як ты стаяў у майстэрні рымара ў Рыме
альбо ў ганчарні на Ніле. Паказвай яму
рэчаў нявіннасць, іх шчасце, іх крэўную нашасць,
і пакажы, як пакута прымае аблічча яе,
служыць за рэч і канчаецца ў рэчы, каб потым
ужо на тым свеце ад скрыпкі шчасліва ўцячы.
Рэчы, што ў смерці жывуць, зразумеюць хвалю,
бо яны, тленныя, просяць ратунку ў нас тленных,
думаюць, пэўна, што мусім у сэрцы нябачным
ператвараць іх у нас — бясконца ў тых нас,
якімі мы ўрэшце станем.

Aber weil Hiersein viel ist, und weil
uns scheinbar
alles das Hiesige braucht, dieses Schwin-
dende, das
seltsam uns angeht. Uns, die Schwindend-
sten. Ein Mal
jedes, nur ein Mal. Ein Mal und
nicht mehr. Und wir auch
ein Mal. Nie wieder. Aber dieses
ein Mal gewesen zu sein, wenn auch nur
ein Mal:
irdisch gewesen zu sein, scheint nicht
widerrufbar.

Аўтограф Р. М. Рыльке
з дзевятай «Дуіненскай элегіі»

Хіба сапраўды ты хочаш, зямля, адрадзіцца
нябачнай у нас? Ці не гэта — нябачнасць! — было
даўнім жаданнем тваім? Нябачнасць! Зямля!
Ператварэнне — найбольшая мара твая!
Зямля, я люблю цябе. Вер мне, няшмат мне патрэбна
вёснаў, каб я пакарыўся табе. Мне даволі
нават *адной* — і яе ўжо ў крыві дастаткова!
Безыменны ляцеў я к табе з далёкае далі.
Вечна ты слушная, і прасвятленне тваё —
даверальная смерць.

Бачыш, жывы я. Чаму? Ні дзяцінства,
ні будучыня не паміраюць у сэрцы маім...
Звышжывое жыццё
з сэрца крынічыць майго.

ДЗЕСЯТАЯ ЭЛЕГІЯ

Хай бы хоць раз на зыходзе жорсткага знання
славу запеў я і радасць анёлам зычлівым.
Каб аніводзін з грозных молатаў сэрца
марна не біў, каб трапляў па мякка-сумненных
струнах парванай душы.
Каб успыхнуў нятленна
твар мой абмыты; каб чыста-празрыстыя слёзы
твар арасілі. О, як бы тады я любіў
ночы засмучаныя! Тады перад вамі,
сёстры няўцешныя, больш бы не кленчыў і ў
косах
вашых распушчаных не абудзіўся б ніколі.
Мы — адмаўляльнікі боляў. Іх мы прадбачым
у смутным чаканні — закончыцца мусяць яны.
Болі — азімае лісце, цёмны барвенак,
адна з пораў таемнага года — не толькі
пара̀, а і месца, паселішча, грунт і жытло.



Вера Оўкама-Кнооп (1900—1919)



Стары замак Мюзо (Шато дэ Мюзо)
да рэстаўрацыі ў 1900 г.

Ах, якія чужыя завулкі Горада Мукі,
дзе ў цішыні фальшывай, складзенай з гукаў,
вылітай з формаў пустэчы,
высіцца трэснуты помнік — шум пазалочаны.
О, як стаптаў бы анёл іхні Рынак Уцех
каля сабора, куплены цалкам:
чысты, замкнуты, пусты, як нядзельная пошта.
А навокал яго вечна віруе кірмаш.
Арэлі свабоды! Штукарства заўзятасці звыклай!
І долі ўпрыгожанай лялечны цір,
дзе бляха дрыжыць і грукоча, калі
шчасціць стралку. І Рынак ад воплескаў,
ад захаплення віруе; батлейкі, вярцепы
вабяць, равуць, барабаняць. Дарослым цікава
бачыць, як множацца, анатамічна амаль,
грошы; не толькі цікавасць: бачаць прыроду
грошай яны, і працэс, і вынік, і ўсё да канца —
гэта і вучыць, і робіць плоднымі іх....
...Рынак пакінем,
бо за парканам адразу, дзе шыльда
«Ад смерці паможа»,—
горкае піва, якое здаецца салодкім
тым філосафам-спажыўцам, што жыццём
і яго спасцігненнем закусваюць горыч...
А за парканам, адразу, ўжо *дзейнасць* пануе:
дзеці гуляюць, і наасобку — каханкі,
там жа, наўзбоч, на ссохлай траве
цешацца воляй, прыроднай раскошай сабакі.
Хлопцу цікава далей — і здаецца, што Скруху
ён пакахаў маладую... За ёю на луг
ён пераходзіць... І кажа яна:
«Пойдзем далей. Бо далей мы жывём...»
А дзе?
І закаханы юнак ідзе следам. Постаць яе
вабіць яго — яе плечы і шыя...— Відаць,
з добрага роду яна.

Але хлопец пазней
кіне яе, адвярнуўшыся пойдзе назад,
развітальна махне ёй рукой... Што рабіць? —
Гэта ж — Скруха...

Толькі і юныя душы на першай пары
пазачаснай адвыкласці і раўнадушнасці
пойдуць за ёю з любоўю. Дзяўчат
пачакае яна, пасябруецца з імі. Пакажа
потайкам цела сваё. Пацеркі мукі,
вэлюм цярпення.— А з хлопцамі моўчкі далей
пойдзе яна.

Там жа, ў даліне, дзе Скрухі жывуць,
Скруха старая за руку хлапца
возьме і скажа яму: «Мы калісьці былі,
Скрухі, з вялікага роду,— так скажа яна.—
Нашы бацькі працавалі ў капальнях глыбокіх
гор высачэзных; яшчэ можна сёння знайсці
адшліфаваны кавалак Пра-мукі ў людзей
ці скамянелы асколачак гневу з вулкана.
Бо — ён з вулкана. Багата жылі мы тады».

І павядзе яго лёгка далей, па Краіне Скрухі,
хлопцу пакажа калоны сабораў, руіны
замкаў былых, дзе калісьці магнаты Краіны
мудра вялі гаспадарку. Пакажа яму
высачэзныя Дрэвы Слёз і Палеткі
пышна расцвілай Журбы (ўсе жывыя
бачаць там толькі лісточкі пяшчоты),
статкі Жалобы на пашах пакажа хлапцу —
часам пырхне спалохана птушка і разарве
погляд іх лётам імклівым, працягне ў паветры,
як адчувальную ніць, асамотнены крык.
Вечарам Скруха яго павядзе да магіл
продкаў са Скрушнага роду, сваіх вешчуноў.

Зблізіцца ноч, і пакрочаць паволі; ўгару
месяц узыдзе, абсягаў усіх вартавы,
помнік нядрэмны, крэўны аблiччам сваім
нільскаму сфінксу,
ахоўніку вечнае тайны.
Помнік здзіўляе іх царскі, помнік, што твар
моўчкі паклаў навекі на шалі
зорнай вагі.

Гэтага ўбачыць не здолее той,
хто заўчасна памёр. Толькі погляд яе
выганіць соваў з падвойнай кароны. Яны
мяккім, лагодным павевам крануцца іх шчок,
тых акруглаецяў спелых,
і ўмалююць пяшчотна ў новы
слых памерлых, на ліст
двойчы разгорнуты,
свой неакрэслены, смутны абрыс.

Зоркі — вышэй. Новыя. Зоркі Краіны Пакут.
Скруха паволі іх называе: «Вунь там,
бачыш: *Коннік*, там — *Посах*, а поўнае тое
сузор'е —
Нізка Пладоў. А далей — *Калыска,*
Шлях і *Кніга Агню, Лялька, Акно.*
А на паўднёвым небе, чыста, нібы на далоні,
блаславўляе накрэслены зоркамі *знак,*
што азначае — *Маці*»....

Толькі памерлы павінен адгэтуль ісці,—
Скруха старая вядзе
берагам бездані,
дзе пад промнямі поўні
радасці зззяе крыніца. Пачціва
Скруха яе называе: «Струмень
гэты сплаўляе людзей...»

Моўчкі стаяць ля падножжа гары.
З плачам яна абдымае яго.

Ён на Пра-мукі гару адзінока ўзыходзіць.
Крокаў яго не чуваць у бязгучнасці лёсу.

*

Толькі ж памерлыя ў нас абудзілі
вобраз няясны, падобны на знанае нешта;
глянь,— можа, гэта і ёсць каташкі,
што абвісаюць з пустое ляшчыны, альбо
ліўні нагадваюць, што напрадвесні
цёмную пояць раллю...

Мы, хто *ўзнёсласці* ў долі
прагне, мы адчуваем трымценне,
якое, калі ападае Шчасце,—
нас *узрушае.*

САНЕТЫ АРФЕЮ
(1922)

Як эпітафія Веры Оўкама-Кнооп

ПЕРШАЯ ЧАСТКА

I

У росце дрэва: чыстае ўзрастанне!
О спеў Арфея! О спяванне дрэў!
Замоўкла ўсё. І нанава ў маўчання
пачаўся рух, пачаўся рост і спеў.

Ішлі звяры — з таемнае бярлогі,
з гушчарных лежняў і глыбокіх нор —
не іх драпежны нораў вёў праз бор,
не страх прыцішыў іх да асцярогі,—

вяло пачутае. Крык страшных драм
аціх у сэрцы іх. І там, дзе ў слыху
прытулак быў для сочкі і для ўлову,

дзе ў слыху быў апошні ключ да схову,
дзе гніў тады аплот жыцця пацІху,—
цяпер Арфей паставіў песні храм.

II

Нібы дзяўчынка выбегла з мяне,
калі яе пазвала ліры песня.
Дзіця гармоніі, дзіця прадвесня,
мой слых запаланіўшы, ў лёткім сне

забылася. І высніла яна
чужую даль і хвалі роднай нівы,
дзе я знаходзіў дзіва міг шчаслівы
і ўсё, чым жыў уражліва здаўна.

Свет спаў у ёй! О, чым, Арфей-пяюн,
зачараваў яе, каб не жадала
яна прачнуцца? Сонную стварыў!

Дзе смерць яе? Ці знойдзеш ты матыў
для іншай песні — каб не памірала?..
Дзяўчо знікае... ў заміранні струн...

III

Бог гэта змог. А як жа — чалавек?
Праз вузкасць ліры ён не прадзярэцца.
Двaісты ён. На скрыжаванні сэрцаў
не мецьме храма Апалон вавек.

Твой спеў — урок. А нам патрэбен звон,
нас парывае толькі перамога.
Спеў ёсць жыццё. Салодкае — у бога.
А як жа *мы?* Калі ж паверне *Ён*

да нас арбіты зор? Не будзе, хлопча,
табе ў любві патолі заўтра,
калі прарвацца з сэрца песня хоча.

Мінецца ўсё. Забудзь, што ты пясняр:
па-іншаму гучаць павінна праўда.
Яна — парыў. І вецер. Божы дар.

IV

О пяшчотныя! Хоць вас не кліча
мяккі подых кахання, смялей
уваходзьце ў яго, хай аблічча
вам аблашчыць яго любавей.

О шчаслівыя! Коранем зрухаў
сталі вы і пачаткам уцех,
мэтай стрэлаў і стрэламі лукаў —
хай звініць ваш заплаканы смех.

І не бойцеся мукі і гора,
кіньце іх прыцягненню зямлі —
важкасць маюць і горы, і мора.

Цяжкасць маюць і тыя дрэвы,
што пасаджаны вамі былі.
А прастора... а ветру павевы...

V

Не стаўце помнікаў. Няхай пяшчота
вясною ружы расхіне бутон.
Яна — Арфей і ёсць. Яго істота
ва ўсім жыве. Не трэба нам імён

ствараць, калі ўжо ёсць імя куміра,—
Арфей у памяці не прападзе,
але і ён памрэ. Затое ліра
даўжэй за ружу гукамі цвіце.

Памрэ і ён — як цяжка зразумець!
Але яго нятленнай песні гукі
цялесны тлен перажывуць і смерць.

Ён вас туды з сабой не забірае.
Яму ўжо струнаў дрот не рэжа рукі.
Ён крок зрабіў — і ў вечнасці іграе.

VI

Можа, тутэйшы ён? Не, у ім зліты
сілы духоўныя дзвюх дзяржаў.
Той гне дасведчана голле ракіты,
хто корань дрэва добра спазнаў.

Хлеб, малако прыбірайце з абруса
нанач і дайце ім вечны спакой,
мёртвым, не надзьце іх душы спакусай.
Ён, Заклінальнік, пакажа свой

вобраз у бачным, нябачна пачаты:
ў пахах зямлі і церпкае мяты
бачыць ён толькі сувязь прычын.

Ён немагчымы без гэтай карціны:
ён і ў жыцці, і ў цісках дамавіны
ўславіць віно, хараство і жанчын.

VII

Хай жыве слава! Ганец яе звонкі
вылушчыўся, як з пароды руда,
з моўчы адвечнай! Вінныя гронкі
сэрцам ён трушчыць — і льецца вада

хмельная з невысыхальнай крыніцы.
Голас не спрахне, не змоўкне пясняр!
Спеляцца гронкі паўднёвай вінніцы
у цеплыні яго сонечных чар.

Славы яго не зацьміла грабніца
з царскаю гніллю, і цень алімпійца
сполаху на спевака не атрос.

Ён — вечнаісны, ацалены Веснік,
што ў Браму Мёртвых зямныя песні,
нібы плады ў поўнай чашы, пранёс.

VIII

Вольна ў храме славы пераможнай
толькі Жальбе, німфе слёз. Але
ёй даверыць нашу скруху можна,
каб відна была на той скале,

на якой уцверджана святыня —
брамы велічныя, алтары.
І яна ж, малодшая багіня,
ў сонме юных вяне без пары.

Радасць моўчкі *дружыцца* з Маркотай.
Толькі Жальба, як дзяўчынка, ўпотай
лічыць беды колішнія горка.

А як выльецца за берагі
голас наш, засвеціцца, як зорка,
ёю ўзнесены ў прастор смугі.

IX

Той, хто бярэ ў царства тла
ліру з сабою,
творыць, каб песня была
вечнай хвалою.

Той, хто з мёртвымі еў
мак на бяседзе,
ліры Арфеевай спеў
помніць і ў Леце.

Вобраз, адбіты ў вадзе,
зыбка-празрысты,
не забывай.

Толькі тады правядзе
голас прачысты
за жыццякрай.

X

Гонар табе, верны сябар душы —
саркафагаў антычных плесня;
быццам суму вандроўная песня,
праз цябе плыве Рым у цішы.

Адчынілася века — нібы пастушок
пагпядае лянiва дрымотным вокам.
Там пад векам утульна і пчолкам,
кукліцца там і начны матылёк.

Марных надзей вы не прынялі —
гонар за гэта, бяззубыя пашчы,
моўчкі ўсе тайны вы ўберaглі.

Што ж, мы таксама не любім крычаць,
церпім пакорна, як час лядашчы
нам на аблiччы кладзе пячаць.

XI

Глянь: сузор'е *Коннік!* А хто знае
корань назвы? Паэтычны троп
з гордасці зямной! Герой кілзае
сябра і прастуе наўгалоп.

Ці ж не гэта бо — цуглянне, прага! —
сутнасці прыроднай вечны рух?
Бег — аброць. Іх спалучыла цяга
да прастораў новых. Еднасць двух!

А ці *ёсць* яна? Ці ўпрочкі
лёс не развядзе няўмольны іх?
Зблізяцца ці разляцяцца моўчкі?

Лучнасць зорная — мана, пункцір.
Суцяшаем мы сябе саміх
вераю ў прыдуманы блізір.

XII

Слава духу лучнасці! Жывём
вераю ў блізір, у сімвал зорны.
А ў гадзінніка бег ілюзорны
і не ўпоравень з сапраўдным днём.

Мы, свайго не ведаючы месца,
робім справу між замкнутых сцен.
З нашай сутнасцю паразумецца
даль не ўмее моваю антэн...

О напружанасць! Ігра прыроды!
Ці не шмат мы нарабілі шкоды
тым, чаго яднаннем дасяглі?

Нават сейбіт кіне зерне ў глебу
і не бачыць, як прырода хлебу
сок дае. Вялікі *дар* зямлі!

XIII

Слівы, яблыкі, агрэст, маліны...
Гэты смак, садовы спелы дар,
жывіць нас і губіць безупынна.
Гляньце на дзіцячы свежы твар:

сутнасць плода пад румянцам шчок.
Сэнс яго — не сказаныя словы,
а з густое мякаці цукровы
адмыслова вызвалены сок.

Што ж вы яблыкам назваць маглі?
Даўкасць гэту, саладосць, кіслоцце,
што пасля, расплыўшыся па роце,

растварыўшы сонечнасць зямлі,
прычашчае нас віном яднання!
О пачуццяў плод, о плод пазнання!

XIV

Мы росцім кветкі, вінаград, плады,
і мова іх — не толькі мова года.
Страката-яўнае нам шле прырода
з прынадным глянцам вечнай цемнаты

ад тых былых, што леглі ў дамавіну,
што пра удзел свой у жыцці маўчаць,
між тым кладуць свабодную пячаць
на неўрадлівую, скупую гліну.

Ці з радасцю нябачна служаць нам?
Ці гэтыя плады — рабоў тварэнне —
не грозяць кулакамі нам — панам?

Паны не мы, а *тыя*, ля карэння,
а мы жывём з іх шчодрых падарункаў:
з настоек сіл нямых і пацалункаў.

XV

Смак... Прападае, як зелень садоў!
...Музыка толькі, і тупат, і жарты;
цёплыя, негаваркія дзяўчаты,—
як станцаваць смак даспелых пладоў!

Смак апельсіна! Ну, хто ў нас не знае,
як прытупляе ён саладосць,
што гэтак вабна ўсіх ап'яняе
і абуджае ў старых маладосць?

Вы апельсін мне станцуйце! Згасіце
полымя поўдня, а небу айчыны
спеласць аддайце. Водарам спёк

можна пагардзіць — але ж парадніце
з пругкасцю і чысцінёю лупіны
плода гарачы, салодкі сок.

XVI

Дружа мой, ты адзінокі ўдвайне...
...бо *мы* праз жарты і ўладнае слова
падпарадкоўваем свет паступова
у найслабейшым яго звяне.

Хто нам пакажа пальцамі пах? —
О небяспечна варожыя сілы!
Ты адчуваеш пагрозу магілы,
мёртвых закляцці распальваюць жах.

Трэба абломкі збіраць старанна,
быццам схавана ў іх цэльнае нешта.
Цяжка табе памагчы. Выкінь, зрэшты,

з сэрца мяне. Я б далей вырастаў.
Я б узяў за руку *майго* пана:
«Тут я, у шкуры звярынай Ісаў».

XVII

Старча мой, у глыбіні
светабудовы
ў змроку цякуць карані —
свету асновы.

Пращчы, сякеры, шчыты —
пошчак іх востры,
люта лютуюць браты,
як лютні — сёстры...

Сплеценыя ў цемнаце
мкнуцца да шыры...
Вось і наступны ідзе...

Парасткі любяць прастор.
Гэты прарваўся... прасцёр
рукі да ліры.

XVIII

Чуеш? — новае, бог,
грукае ў дзверы?
Пераступаюць парог
веснікі эры.

Вушы глушыць няхай
жалезным шквалам,
толькі грымі, не сціхай,
ґімн металам.

Бачыш? — хімерна:
бразгат, грукат, ляск —
жылы выцягваюць з нас.

Вымі з нас усю моц,
машыннахалодны мозг,
і — служы верна!

XIX

Хоць і мяняецца свет,
ценем імгліцца,
вернецца цэльнасць на след —
к першакрыніцам.

І самы першы акорд
ліры Арфея
лучыць зменлівы ход
мараў, надзеяў.

Хай не спазнана любоў,
боль не спазнаны і страх,—
мы адыходзім у прах,

вырваўшы з плесні,
з прахлых акоў
светлыя песні.

XX

Чым аддзякаваць, божа, табе за твой дар?—
Ты настроіў наш слых на ігру...
Мо ўспамін пра Расію, пра весні прыпар
і пра тупат каня... падару?..

Помню сіўку таго — ён падвечар уцёк
з вёскі ў поле з палону калёс —
за сабой на вяроўцы калок ён валок,
галавою грывастаю трос,

шыю хвошчучы ў такт. Паспрабуй жа злаві,
супыні той мяцежны галоп,
калі полымны жар у крыві!

Конь спяваў! Конь свабодаю дыхаў і хроп!
Уключы яго вобраз у кола былін —
прысвячаю табе
гэты гімн!

XXI

Зноў зазвінела вясна. Уся прырода,
нібы дзіця, наштукарыла штук,
вершыкаў шмат... Быццам узнагарода
рупнасці за спасціжэнне навук.

Строгі ў дзіцяці Настаўнік! Мы іней
цэнім у мудрай яго барадзе.
Што ёсць у зелені, чырвані, сіні —
ўсё ён раскажа і ўсё давядзе.

Вольная ты, зямліца, малечы
нянькаю будзь у пагодны час весні.
Наша ты, злоўленая зямля.

Многа з таго, што Настаўнік засведчыў,
ёсць у карэнні тваім і ў песні,
ў дужых, магутных, адвечных камлях.

XXII

Нам — рух скараецца.
Часу адмераны крок —
толькі малы драбок
вечнасці, што мінаецца.

Ўсё, што спяшаецца,
кане ў аджыты час;
што затрымаецца,
высвеціць потым нас.

Хлопча, марна не мрой
ні спешнаю страснасцю,
ні лётам удалечыню.

Дай усяму спакой:
цемры і яснасці,
кветцы, начы і дню.

XXIII

О, калі толькі парыў,
не ад кіпення імпэту
кінуты ў моўчу сусвету,
ціха не згасне ўгары,

ці, калі ў профіль ясны
высвеціцца апарат,
ветру любімец страсны,
звонка-крылаты снарад,

8 Зак. 2388

ці, калі мэта «Куды?»
падпарадкуе мэту
юных ілюзій, тады,

высі скараючы ў лёце,
хлопец у далечы свету
стане сабой на самоце.

XXIV

Ці ж выракацца сяброўства старога нам варта
з вамі, няўмольныя боствы, за тую правіну,
што не бярэ багоў сталь наймацнейшага гарту;
ці вас на картах шукаць мы павінны няспынна?

О сябры ўсемагутныя, што забіраюць
мёртвых ад нас,— з жалезных кпіце вы калёсаў;
мы ж правім трызны свае без удзелу нябёсаў,
бо пасланцы вашы нас, як заўжды, абмінаюць.

Мы адзінокія ўсюды, і мы павінны
верыць сабе і пракладваць шляхі свае самі,
нашы шляхі — не меандры, мы нашы сцяжыны

крэслім, як градусы. Даўні агонь пад катламі
молат угору ўздымае ў магутнай рабоце.
Мы ж, як плыўцы, расцярушваем сілу ў самоце.

XXV

Толькі *Цябе я, Цябе,* каго кветкаю знаю
і невымоўна імя чыё ў сэрцы нашу,
зноў уваскрэслую радасна прывітаю,
п выканаўца няскончанага мяцяжу.

О, ты ж — танцорка, што цела сваё спыніла
раптам, нібыта ў яго ўлілася медзь;
чула-журботная... Нібы магутная сіла
музыкі ў змененым целе стала звінець.

Блізка хвароба. Ужо цень яе ўладна зняволіў
кроў пацямнелую, хоць баязліва-паволі
мкнулася ў свет натуральны вясны і святла.

Зноў яна й зноў, разарваная цемрай, падзеннем,
рдзела зямлёю і сэрца жахлівым трымценнем
у несуцешную браму нарэшце ўвайшла.

XXVI

Ты, паўнагучны, прыгожы ў суладдзі мелодый,
роем акружаны лютых, распусных менад,
лямант суцішыў узнёслаю песняй лагоды
і з разбурэння стварыў дасканаласці лад.

Ліра не выпала з рук, не паддаўся кляцьбе,
як ні глумілася з песні звяр'ё ліхое,
кідалі ў сэрца каменне; каменне глухое
слых здабывала і слухала моўчкі цябе.

Так і загінуў ахвяраю помсты і зла
ты, а не песня, бо птушкі яе падхапілі,
скалы і дрэвы. І ў рэчах яна прарасла.

Бог несмяротны ў сугуччах чароўных зямлі,
мы тваю музыку ў сэрцы сваім ажывілі,
поўніцай іх у прыроду пералілі.

ДРУГАЯ ЧАСТКА

I

Дыхай на поўныя грудзі, нябачны мой верш,
акружаны зменлівым светам!
Я ж — процівага. Змяшчаецца ў ёй найперш
рытм — як сутнасць паэта.

Морам зрабіўся вечным
я для цябе, о еднасць хваль;
морам самым шырокім і невыцечным —
распасціраннем удаль.

Колькі прастораў тваіх у мяне ўнутры!
Растуць маімі сынамі
твае вятры;

слоў абалонай, карою і круглай лістотай
стала паветра. Што ж, я прызнаны
роднай маёй істотай.

II

Майстар умелы паглядам акіне
аркуш і бачыць *закончаны* твор;
гэтак з'яўляецца ў люстры дзяўчыне
ўсмешка святая, адзіная; зор

ранішніх промні вітаюць са шкла
цьмянае свечак начных калыханне.
Так і ў рэальных абліччаў дыханне
падаюць толькі адбіткі святла.

Што нашы вочы з-пад прыску ў каміне
здолелі высачыць, згледзець змаглі?
Позірк жыцця, што прайшло назаўсёды.

Хто, зямля, страты твае ў сэрца прыме?
Той, чыя песня, як лямант зямлі,
ўславіла сэрца суцэльнай прыроды.

III

Люстры: што ў сутнасці вашай забыта,
толкам ніхто апісаць не змог.
Вы нібы дзіркі-прасветліны сіта,
нібы прагаліны ў плыні эпох.

Люстры, як залаў пустынных аздоба,
цьмяныя вы, як гушчэча бароў...
І кандэлябр разгалістым лобам,
быццам алень, вашу глуш прапароў.

Часам вы поўны жыццёвых акрас —
нехта хаваецца *ў* вашай глыбі,
нехта нясмела пакінуў вас.

Толькі красуні вабны абрыс
мякка ў табе расплываецца — нібы
шчочкай прынік да паверхні Нарцыс.

IV

О гэты звер, не бачаны яшчэ!
Яго не ведаючы, палюбілі вы
паставу, грудзі, ўзнёсласць галавы
і ціхі бляск, які ў вачэй цячэ.

Ён мог *не быць*. Жыццё яму далі
любоўю вы, жыццю яго пасля —
прастору неабсяжную зямлі.
І вось падняўся ён і спакваля

сабою стаў. Падгадавацца змог
ужо не кормам — змогай жыць адной.
І сілу гэтакую звер здабыў,

што нават рог на лобе вырас. Рог.
К дзяўчыне белы звер прыйшоў, і ў ёй
ён быў далей, і ў срэбным люстры быў.

V

Мускул той, што зранку ў анемоне
пружыцца, каб кветка расцвіла
і ўвабрала ў водарнае ўлонне
з неба паліфонію святла;

завязь кветкі — мускул успрымання,
часам *так* напружваешся ты,
што і ў час апошняга змяркання
ад залішняй жыццепаўнаты

ледзьве здольваеш пялёсткаў крылы
зноў згарнуць у першасныя чашы —
колькіх светаў ты яднаеш сілы!

Мы ж, магутныя, жывём дазвання.
А *калі*, ў каторым з жыццяў нашых
так раскрылімся мы для ўспрымання?

VI

Ружа, царыца красы, ты продкам далёкім —
келіх, узніклы па волі тварца.
Нам — дасканалая кветка з сэнсам глыбокім,
твор, не спазнаны нікім да канца.

Зззяеш багаццем пышнага ўбрання на ўбранні,
цела тваё — толькі бляск, прыгажосць,
толькі ж кожны пялёстак твой — адкіданне
і адмаўленне вопраткі ёсць.

Многа стагоддзяў нам водар салодкі твой быў
самай салодкаю назвай расліны —
славаю ён у паветры застыў.

Сёння сапраўднага так і не знаем наймення,
і мы вяртаемся зноў ва ўспаміны —
перажываць непаўторнасць твайго імгнення.

VII

Кветкі, як блізкія вы тым рукам, чые пальцы
рвалі і складвалі вас у пучок;
кветкі на століку ў ціхай садовай альтанцы,
ў ранах смяротных крывавіцца сок;

вянучы і ў жыватворнай вільгаці ў вазе,
вы лежыце і зусім знемаглі,
прагнучы смерць адхіліць, што ў вас пачалася,
дотыку рук, каб жыцця улілі

большаю мерай, чым глеба ўлівала ў
карэнне; —
вось вы ахоплены горлам збанка,
шчыльна ўціскае ў яго вас пяшчотная жменя,

вось апускае, сагрэўшы сабой вашы раны —
вашу сарванасць зрабіла рука,
смерць запыніўшы, цвіценнем буяным.

VIII

In memoriam Эгана Рыльке

Мала ўжо вас, супольнікаў гульняў дзіцячых,
у гарадскіх чэзлых скверах са мной:
там мы шукалі й знаходзілі ў дружбе ўдачы
і, як ягняты з травой трапяткой,

гутарыць моўчкі маглі. І бывала,
радасць не збочвала з нашых слядоў.
Сцерлася ўсё пад нагамі людзей і прапала
у наплыванні трывожных, бясконцых гадоў.

Ехалі міма чужыя карэты, навокал
цвёрда стаялі старыя муры, камяніцы
і не зважалі на нас. *Што* ўмяшчаў той Сусвет?

Толькі мячы... І чароўнасць гарэзных падскокаў.
Нават не дзеці... Часам хлапчо прабяжыцца,
знікнуўшы ўмомант, за мячыкам пругкім услед.

IX

Не выхваляйцеся, суддзі, што дыбы й гароты
лішнія сталі, што горлы не душыць сталь.
Дзе ж узвышэнне душы? — калі курчам ляшчоты
круціць часамі вам сэрца спагадлівы жаль.

Што эшафот атрымаў ад мінулых эпох,
сёння адкінуў, як цацку старую малое,
маючы ўдосталь забаў. У алтарна святое
сэрца, нібыта ў браму, ўваходзіць бог

песты і ласкі душэўнай. А сам ён магутны
і прамяністы, якім бог і мусіць быць,
моцны, *дужэйшы* за вецер, што гоніць судны,

і не слабейшы за бачныя выяўленні,
што праз пачуцці ўмеюць нас моўчкі скарыць,
нібы дзяцей бясконцыя пакаленні.

X

І дасягненні твае можа разбурыць машына,
сцвердзіць захоча калі не ў паслушэнстве сябе,
а ў пранікненні ў твой дух. Моц яна ўжо скрышыла:
скобліць і рэжа метал, скалы, каменне дзяўбе.

Нам ад яе не ўцячы, ў гонцы яна пераможа,
шум ёй заводскі падай, а не зацішны двор;
сёння ў машыне жыццё, лепей за нас яна можа
новае гожа ствараць і разбураць свой твор.

Нас яшчэ вабіць пакуль тая струменнасць, якою
рух у вытоках жыве; верым жыццёвым дзівосам
і спазнаём спакваля сутнасць — пакоры цаною.

Невымоўнае ўсё — ў словах схавана яно...
Музыкі вечны матыў з мёртвых дрыготкіх уцёсаў
у беспрадметны прастор храм свой узнёс даўно.

XI

Многа стварыла ты, смерць, правілаў і запаветаў,
што паглынаюць людзей, звеку, як сееш свой мор;
лепей за пасткі ўсе, ветразь, цябе я ўведаў,
ветразь, узняты пад столь к чорным пашчам пячор.

Ціхенька ўзнеслі цябе, нібыта сімвал спакою,
міру і свята. Але — часу не траціў лавец —
цемра з пячоры ў святло кінула чорнай рукою
жменю спалоханых птушак...
Іх згубны канец...

Хай не кране гледача слабасць і жальба спагады,
хай не кране і яго — выбраў удала ён міг,
упільнаваў птушкалоў...

Форма жалобы — забіць; часам і ёй мы рады...
Чыстае ў нас саміх —
дух наш, уселены ў кроў.

XII

Змены жадай у сабе. Будзь на кастрышча гатовы,
каб сваёй форме быцця іншую форму надаць;
вечна творчы твой дух ладзіць Зямнога асновы,
бачыць пункцір у тым, што ўжо змагло паўстаць.

Што ў канчатковым жыве, сцішную стыласць *раджае*,
ці ж абароніць яго вечна жахлівая даль?
Цвердзі цвярдзейшае ўжо з будучыні пагражае.
Молат нябачны ўгары, молат падняты... на жаль!

Хто, як крыніца, цячэ, той на прасторах пазнання
з гордым уздымам ідзе к творча-ўзнёсламу Заўтра,
дзе ўсё з канца ён пачне, дзе дасць пачатку канец.

Ўсякі шчаслівы прастор — сын або ўнук расставання,
ваш непазбежны шлях. Нават у вобразе лаўра
Дафна адчуе галлём твой злагаднелы вятрэц.

XIII

Ростань пакінь за сабой, як зіму ледзяную,
што яшчэ доўжыцца ў колкіх сіберных вятрах.
Бо ёсць зіма без канца, ззімаваўшы якую,
сэрца тваё перасіліла сцюжу і страх.

У Эўрыдыцы будзь мёртваю... і з песнапеннем,
з гімнам у чыстую сувязь уліся і тут,
тут, сярод ценяў, у царстве астанкаў, трымценнем
звонкага шкла адзвіні, бы ў асколках сасуд.

Шклом будзь — і ўведай умовы быцця нежывога,
ўздыму душэўнага ўведай прычыну, якога
поўніцай большай не зведаць бясконцых асноў.

Да скарыстаных, маўклівых запасаў прыроды,
да яе звону сябе залічы назаўсёды
з радасцю раз — і без ліку навекі вякоў!

XIV

Бачыш ты кветкі — вось верныя целам зямляне,
мы іх адорваем лёсам сабе ж для акрас;
хто гэта ведае? Каецца кветка, што вяне,
каянне кветкі залежыць ад нас.

Рэч прагне ўзлёту! А мы саматужна груваспім
груз чалавечы на плечы прыроды, хоць мы,
нібы настаўнік настырны, не вучым, а засцім
тым, каму шчасціць быць вечна дзяцьмі.

Хай бы хто ўзяў іх у сон свой глыбокі, да рання
спаў з імі разам... як лёгка было б з аднаго
дня ў новы дзень перайсці ад нямога яднання.

Хай бы застаўся і ў сне; цвілі б разам і ў лона
вернутага мы хвалілі б як брата свайго
пад абаронай агульназямнога закона.

XV

Калодзеж з нетраў, жыццядайны рот,
што чысцінёй крынічыцца заўжды,
ты — мармур маскі на вачах вады,
што вільгаць струмкую сваіх шчадрот

па акведуку шле сюды здалёк
з круч Апенін паўз могільнік стары —
тваёй гамонкі вечнай ручаёк,
які чарноццем рыс тваіх згары

бесперапынна ў амфару цурчыць.
Ён — вуха з мармуру, якое спіць,
а ты ўсё шэпчаш нешта зноў і зноў.

Зямное вуха ён. З табою так
зямля гаворыць. А падставіш гляк,
і здасца — перабіў цячэнне слоў.

XVI

Зноў і зноў імкнёмся мы да Месца,
што нас гоіць і завецца — бог,
прагнучы да ісціны даўмецца,
ды не ўсім даступны той парог.

Бог прымае ў тайны свет няўзрушна
нават чысты, асвячоны дар,
сочачы спакойна і бяздушна
за агоніяй сваіх ахвяр.

Толькі мёртвы п'е
у *пачутай* тут крынічнай рэчцы,
як дазвол на гэта ёсць ад бога.

Нам жа — толькі марны шум зямнога.
Бомку гэтак вешаюць авечцы —
на інстынкт разлічваюць яе.

XVII

Дзе і якія, шчаслівай расою акропленыя палеткі,
дрэвы якія ці ўскрыленыя пялёсткамі дзіўныя кветкі
родзяць плады суцяшэння? А ты найспялейшы знаходзіш
плод пад нагамі на лузе ўтаптаным, дзе кожны дзень ходзіш

сцежкай галечы сваёй. І кожны раз нанава з гэтага плода
дзіву даешся ты: з велічы, з ядранасці, з кажуры
цэльнай яго, далікатнай, і таго, што краса і пяшчота
легкадумнасцю птушкі альбо ненасытных чарвей без пары

не адабрана ў цябе. Ці ёсць дрэва пад кронай анёльскіх крылаў
тайным садоўнікам пешчанае — каб намі яно не пладзіла,
ці не належала нам, ці не было нашай плоццю сагрэта?

Хіба не мог бы з нас, ценяў і схемаў, ніколі нідзе аніводзін
спеласцю ранняй, заўчаснаю звяласцю нашых паводзін
супрацьпаставіць сябе раўнадушнай бясчуласці лета?

XVIII

О танцорка! О, колькі духу
мінулага ў існасці кроку; увенчвае ход —
танец-віхура, як дрэва мяцежнага руху,
што завяршэнні ўбірае ў сябе за шмат год.

Ці таму, што палётам сваім галінастыя шаты
абняла і сагрэла яму, дрэва не расцвіло?
Ці не ты — над ім сонца і лета, а ў ім — не душа ты?
Ці струменіць з яго не тваё цяпло?

Уродзіць багата дрэва твайго экстазу.
Ці ж не з дрэва вось гэты дзівосна спакойны плод:
ядраны крутабокі збанок і даспелая ваза?

У іх вобразах: ці не твае гэта чорныя бровы,
о танцорка, упісаны, нібыта крылы ўразлёт,
у твой стан, паварот грацыёзна суровы?

XIX

Золата ў банках жыве, разбэшчаных тлустым даходам,
не многім даверыцца ўмее. А для пятака
нават кішэня сляпога старца, жабрака —
месца пагіблае, нібы запылены кут пад камодай.

Грошам выгода ў гешэфтах у крамах. Там для паказу
іх убіраюць у кветкі, у футры і ў камяні.
Ён жа, Маўклівы, сабой запаўняе кароткую паўзу
ў подыху тых, што ў сне і наяве грашаць грашмі.

Хай нават стуляцца пальцы гэтай рукі,
зноў лёс растуліць яе для благання надзённага хлеба,
бледную просьбітку зноў жоўтая спляміць кароста.

Хай бы відушчы ў здзіўленні сказаў нам, які
край тых патрэб. Вымоўных адно песні неба.
Чутных адно вушам боства.

XX

Зорныя далечы не параўнаць з блізкім, даступным,
з тым, што зямля нам дала.
Між гэтым хлопчыкам і вось між гэтым, напрыклад...
наступным?
невымяральная ймгла.

Лёсе, ты мераеш пядзяй умоўнага, пядзяй, якая
павінна
быць уяўленню чужой;
як уявіць сабе пядзі, што лучаць мужчыну
з жанчынай,—
повязі сэрцам, душой.

Далеч — усё; не замкнецца бясконцасці кола нідзе.
Бачыш — як дзіўна глядзяць на прыпраўленым блюдзе
твары маўклівыя рыб.

Кажуць, што рыбы нямыя... А хто гэта ведае, дзе?
Можа, у далечы моваю рыбінай будзе
ісціна сказана *ўглыб.*

XXI

Сэрца маё, апявай не знаёмыя мне сады,
воды і ружы Шыраза альбо Ісфагана;
ясныя, неспасцігальныя кроплі вады,
ўлітыя ў чашу сады — непараўнальна!

Сэрца, скажы, што не прагнеш нічога ў садах,
дзе табе спеюць смоквы ў лістоце, масліны,
дзе табе расквяціліся пышна галіны,—
дзе ты аблiччам адчула высокі іх пах.

Марную думку адкінь, быццам ты памылковай
воляй рашэнне прымала; воля твая гэта — быць!
Дык уплятайся ў тканіну жыццёвага ніткай шаўковай.

Хай табе вобраз здаецца блізкім — у ім
(будзь гэта момант пакут, які нельга забыць!)
цэльнае толькі ўспрымай, як адзіна сатканы
кілім.

XXII

Лёсу насуперак: бытнасці лішкі — у парках
пена густая лістоты ці групы скульптур
каля высокіх парталаў, на гоністых арках,
ці пад балконамі целы каменных фігур.

О сэнс высокі сэрца меднага звона,
што па будзённым б'е і ўзвышае з тла,
альбо ў Карнаку *адзіная* груда-калона,
што амаль вечны храм перажыла.

Сёння сыходзяць лішкі ад нас без звароту
з гарызантальнага, жоўтага дня ў самоту
зырка-сляпуча-праменна-начной цемнаты.

Гэты сыход адлятае, не крэслячы следу.
Толькі і ў трасе палёту па зыбкасці свету,
пэўна, свой сэнс. Без яго не было б паўнаты.

XXIII

Пазаві мяне ў трыванні той гадзіны,
што табе насуперак цячэ:
скажам, як умольны позірк псіны
блізка-міма ля тваіх вачэй

к бачнай ды несппасцігальнай праўдзе.
Твой здабытак — гэта Міма-Ледзь.
Нам — свабода. Нам адстаўка там, дзе
мы разлічвалі трыумф займець.

Мы супыну просім: недарэчы
юным старасць часам, па-старэчы
мыслім пра аджыўшае свой век.

На хвальбу стае натуры нашай толькі;
мы жалеза, ах! — ядловец колкі,
слодыч недаспелых небяспек.

XXIV

О ствральнасці шчасце! О гліна і глей!
Хто падказаў рызыканту, што быў самы
першы,
горад узвесці на жыццяструмкім узбярэжжы,
ўліць у гліняны збанок жыццядайны алей?!

Божышчы! Радасць будуем залежна ад
планаў —
лёс буркатлівы іх разбурае пасля,
хоць у іх смерці няма! Бо ўжо скарыстана
намі і тое, чым станем, як прыме зямля.

Мы — на тысячы год! Нашы бацька і маці
плодныя будучым; спеліцца наша дзіця,
што, паўтарыўшыся, перасягне нас у шчасці.

Мы бясконца адважна мераем час!
Толькі маўклівая смерць нас бярэ ў жыцця —
што ж яна мае сабе, пазычаючы нас?!

XXV

Слухай: першая грабляў песня;
зноў такты працы людской, гамана
у цішыні ўтаймаванай прадвесня
мірнай зямлі. Незнаёмай яна,

прыйшласць, здаецца. Колькі разоў
раз перажытае веру давала,
што амалоджаным вернецца зноў.
Не *ты* яго браў. *Яно* цябе брала.

Нават лісты ззімавалага дрэва
будучай мрояцца жаўцізной.
Знакам здаецца й ласкавасць павеваў.

Чорны хмызняк. І чорна ірдзее
сытна на полі складзены гной.
Час, пакідаючы нас,— маладзее.

XXVI

О, як узрушліва птушка крычыць...
Неспасцігальныя крыку вытокі.
Крык і ў дзіцячых гульнях — далёкі,
міма крыклівых дзяцей гучыць.

Крык — выпадковасць. У далеч прасторы
паступова (як людзі снамі,
ў свет уваходзяць птушыныя хоры)
убіваюцца крыкі клінамі.

Дзе мы? У высі, у тоўшчы эфіру
пнёмся са смехам, як ветрам гнаны
змей папяровы, з ніткі сарваны!

Божа-пясняр! Крыкунам дай міру,
каб парываннем былі апантаны,
каб падымалі голаў і ліру.

XXVII

Час разбуральны, ці ёсць ён паняцце
рэальнае?
Як на гары вечнай замкавы бурыць ён мур?
Сэрца, пануючым божышчам шчыра адданае,—
як і калі згвалціць твой рытм дэміург?

Ці жыццё наша, дрыготліва крохкае,
лёсам прадвызначана заранёй?
Ці карэнне дзяцінства глыбокае,
шматабяцальнае, ціхне — пазней?

Ах, гэты прывід Часовага
праз давер прымусовага
успрымання праходзіць, бы ймгла.

Якія мы ёсць — мы дзейсныя,
бачаць нас сілы нябесныя
часткаю творчай святла.

XXVIII

Прыйдзі і зноў ідзі. Дзіцятка целам, духам,
у танцы завяршы той эпілог
нябесных зор, дзе б непаўторным рухам
тупую ўладнасць быту перамог

паддалы чалавек. Чароўным спевам
Арфея ўражаная, ты чужой,
трывожнай стала з той пары, як дрэва
вагалася, ці варта за табой

услед ісці туды, дзе ён, пясняр,
дзе ўсё трыумфам хараства абнята
і дзе чуваць пявучыя акорды.

Туды знайшла ты шлях прыгожы, горды
жаданнем шчырым павярнуць да свята
і крокі сябра, і душу, і твар.

XXIX

Чуеш, даляў ціхі друг,— прастора
шырыцца тваім дыханнем тут.
Са званіцы змрочнага сабора
зазвані сабою. Гэта — цуд,

цуд і крок да будучай задачы.
Адчыняй жа ў новы змест акно,
бо мінулы вопыт твой лядачы.
Хочаш выпіцца, дык стань віном!

І праз вакханаліі дзівос,
растаняў, пачуццяў чалавечых
стань спазнаным сэнсам іх, вянцом.

А калі зямны пакіне лёс,
ціхаплыннай рэчцы: «Да сустрэчы!
Я жыву!» — скажы перад канцом.

ЗАЎВАГІ АЎТАРА

ДА ПЕРШАЙ ЧАСТКІ

X санет. У другой страфе маюцца на ўвазе дамавіны на славутым старажытным могільніку Алісками непадалёк ад Арля, пра які ідзе гаворка і ва «Успамінах Мальтэ Лаўрыдса Брыге».

XVI санет. Гэты санет адрасаваны сабаку. У словах «я б узяў за руку майго пана» вызначана стаўленне да Арфея, які тут з'яўляецца панам паэта. Паэт хоча ўзяць пана за руку, каб ён блаславіў і сабаку за яго бясконцую адданасць і спагаду, сабаку, які, падобна Ісаву, толькі накінуў на сябе скуру, каб у сваім сэрцы хаваць надзею на спадчыну, якая не належыць яму,— удзельнічаць у горы і шчасці ўсяго чалавецтва.

XXI санет. Маленькая вясенняя песня здаецца мне адначасова «інтэрпрэтацыяй» дзівоснай танцавальнай музыкі, якую я аднойчы чуў, калі яе спявалі пад час ютрані манастырскія дзеці ў маленькім жаночым манастыры ў Ронда (Паўднёвая Іспанія). Дзеці ўвесь час у такт музыцы спявалі невядомы мне тэкст пад звон трохкутнікаў (трыянглаў) і тамбурына.

XXV санет. Да Веры.

ДА ДРУГОЙ ЧАСТКІ

IV санет. Адзінарог мае прадаўняе, асвечанае ў сярэдневеччы значэнне, звязанае з дзявоцкасцю: сцвярджалі, што ён не існуе аж да хвіліны, пакуль не адаб'ецца ў чарадзейным «сярэбраным люстры», якое трымае перад ім дзяўчына (гл. габелены XVI стагод-

дзя), адлюстроўваючыся ў ім, як у другім, таксама чыстым, таксама таямнічым люстры.

VI санет. Антычная ружа была простага гатунку — «эгланціна», чырвоная і жоўтая, колераў, якія бываюць у полымя. Яна цвіце ў Вале ў некаторых садах.

VIII санет. Ягня (чацвёрты радок) — з карцінак да казак, дзе яно гаворыць толькі прымаўкамі.

XI санет. Спасылка на спосаб, якім, паводле даўняга звычаю паляўнічых, у некаторых мясцінах Краса (Карста) палююць на незвычайных белых галубоў, прадбачліва вывешваючы на пячорах (дзе жывуць галубы) палотны, якія нечакана ўстрасаюць і спуджваюць птушак. Калі яны вылятаюць з падземных прытулкаў, іх забіваюць.

XXIII санет. Да чытачоў.

XXV санет. Рэч, суаднесеная з вясновай песенькай з першай часткі санетаў (санет XXI).

XXVIII санет. Да Веры.

XXIX санет. Да сябра Веры.

Р. М. Р.

1922—1923

ЗАЎВАГІ ПЕРАКЛАДЧЫКА*

«АХВЯРЫ ЛАРАМ»

Л а р ы — у рымскай міфалогіі божышчы-ахоўнікі сям'і і дома.

«ЧАСАСЛОЎ»

Ч а с а с л о ў — праваслаўная богаслужбовая кніга з малітвамі і песнямі сутачнага цыкла набажэнства.

Д а н і і л (да 1492—1547) — рускі мітрапаліт у 1522—1539 гг., публіцыст, узначальнік іосіфлян пасля смерці Іосіфа Валоцкага. Змагаўся з несцяжацелямі і ерэтыкамі.

PONT DU CARROUSEL

P o n t d u C a r r o u s e l *(франц.)* — мост у Парыжы.

АЛКЕСТЫДА

А л к е с т ы д а — паводле грэчаскага міфа, жонка А д м е т а, цара горада Фер у Фесаліі. Да Адмета быў прыхільны бог Апалон, які дазволіў яму ў гадзіну смерці паслаць у Аід каго-небудзь іншага замест сябе. Алкестыда згадзілася памерці замест мужа.

ЛЕДА

Л е д а — паводле грэчаскай міфалогіі жонка спартанскага цара Тындарэя. Зеўс, зачараваны прыгажосцю Леды, завалодаў ёю, прыняўшы вобраз лебедзя.

«РЭКВІЕМ»

В о л ь ф г р а ф ф о н К а л ь к р о й т (1887—1906) — паэт, які наклаў рукі на сябе ў маладыя гады.

---

* Заўвагі складзены паводле розных энцыклапедычных даведнікаў.

*** ШЧАСЦЕ — ЎСВЯДОМІЦЬ...

Вітальд Гулевіч (псеўд. Ольвід, 1895—1941) — польскі паэт, перакладчык паэзіі Рыльке. Замардаваны гітлераўцамі.

ДУІНЕНСКІЯ ЭЛЕГІІ

Княгіня Марыя фон Турн-і-Таксіс-Гогэнлоэ (1855—1934) — адна з найбольшых прыхільніц таленту паэта, у замку якой (Дуіно) ён пражыў зіму 1911—1912 гг.

Гаспара Стампа (1523—1554) — венецыянская паэтэса. Была пакінута сваім каханым. Таму яе вобраз у элегіі ўвасабляе няшчаснае каханне.

Santa Maria Formosa — царква ў Венецыі. Надпіс, пра які гаворыць Рыльке: "Vixi aliis dum vita fuit / post funera tandem. / Non perii, at golido / in marmoro vivo mihi; / Helmanus gulielmus eram / me Flandria luget; / Hadria suspirat; pauperisque vocat. Obiit XVI Kal. Octob. MDXCIII".— /Жыў для іншых, колькі хапіла майго жыцця, але, мёртвы, / усё ж жыву я сабе ў мармуры халодным сваім. / Герман Вільгельм маё імя, / і Фландрыя плача, / горка ўздыхае па мне Адрыя, асірацеўшы. Памёр 16 кастрычніка 1593 года. *(Тлумачэнне Н. Літвінец).*

Лін — сын Апалона і музы Ураніі, у грэчаскіх міфах увасабляе заўчасную смерць у росквіце сіл. У Рыльке Лін выступае як заснавальнік музыкі, падобны да Арфея.

Товій — біблейскі герой, да якога наведаўся анёл. Сюжэт выкарыстоўваўся ў жывапісе Адраджэння і барока.

Аўгуст Дужы (1670—1733) — курфюрст саксонскі і кароль польскі, славіўся сваёй фізічнай сілай.

Subrisio Saltat — «усмешка скакуна», іранічная імітацыя аптэкарскай латыні.

Madam Lamort — пані Смерць *(франц.).*

Карнак — комплекс старажытных егіпецкіх храмаў (16—11 ст. да н. э.).

Шартр — маецца на ўвазе сабор у французскім горадзе Шартры, славуты помнік готыкі.

Падвойная карона — псхент, галоўны ўбор фараона ў Старажытным Егіпце; сіметрычнасць кароны сімвалізавала саюз Верхняга і Ніжняга Егіпта. *(Тлумачэнне Н. Літвінец).*

САНЕТЫ АРФЕЮ

Вера Оўкама-Кноол, маладая дзяўчына, знаёмая Рыльке, якая чаравала паэта грацыяй рухаў, прыгажосцю. Памерла ў 19 гадоў ад лейкеміі, хваробы, ад якой пазней памёр і сам Рыльке.

ПЕРШАЯ ЧАСТКА

Санет XVI

Ісаў — біблейскі персанаж, пастух, апрануты ў казіную шкуру, які прадаў брату Якаву права першародства. Ісаў — чалавек першаснага стану.

ДРУГАЯ ЧАСТКА

Санет IX

Гарота — абруч з вінтом, варварская прылада для катаванняў і забойства задушваннем. Ужывалася ў сярэдневяковай Іспаніі і Партугаліі.

Санет XI

Крас (**Карст**) — горная вобласць на граніцы паміж Італіяй і Югаславіяй, вядомая сваімі пячорамі.

Санет XII

Дафна — у грэчаскай міфалогіі німфа. Каб уратавацца ад закаханага ў яе Апалона, папрасіла дапамогі ў бацькі, рачнога бога Пенея, прыняла вобраз лаўровага дрэва.

ЗМЕСТ

Б. Міцкевіч. Пакуты і надзеі паэта 3
*** Мы — толькі рот... 11

З КНІГІ «АХВЯРЫ ЛАРАМ»

Народны напеў 13

З КНІГІ «УВЯНЧАНЫ МАРАМІ»

І як да цябе каханне прыйшло... (З цыкла «Кахаць») 14

З КНІГІ «ЧАСАСЛОЎ»

«Кніга паломніцтва»

*** ...Я той, паслужлівы твой послух... 15

«Кніга галечы і смерці»

*** Мой бог, да кожнага прыходзь і сцвердзі... 18
*** А беднасць ёсць вялікі светач глыбіні... 18
*** Галетнік беспрытульны ты і ўбогі... . . 18
*** О ты ўсёведны, на чые скрыжалі... . . 20
*** Зірні і ўбач, на што яны падобны... . . 20
*** Яны спакойныя; амаль як рэчы... . . . 20
*** Глядзі, як па жыцці іх ногі йдуць... . . 21
*** І рукі іх дзявочай ласкай надзяць... . . 21
*** Не дыхалі іх вусны, не трымцелі... . . 22
*** І голас іх, пранізваючы даль... . . . 22
*** І спяць яны, аддаўшыся той волі... . . 22
*** І целам кожны з іх — нібы жаніх... . . 23
*** І будуць на зямлі пладзіцца людзі... 23
*** Узвысь іх з прорвы гарадской віны... . 24
*** О, дзе ж ты, Ясная? 24

З «КНІГІ ВОБРАЗАЎ»

Ініцыял 25
Поступ 25
Сур'ёзная гадзіна 26
Вусцішнасць 26
Цішыня 27
Сузіральнік 27
Асенні дзень 29
Кахаць 29
Адзінота 30
Pont du Carrousel 31
Самотны 31

Цары (нізка вершаў)
I *** У той былінны час жылі асілкі... 32
II *** Яшчэ страшыдлы й вогненныя цмокі... 33
III *** Часцей і часцей прыбліжэнцы цара... 34
IV *** Вось час, калі аслеплая краіна... . 35
V *** Самотай ахаваны ад каварства... . . 36
VI *** Яшчэ гарадзь сапфіры і рубіны... . 37
Тытульны ліст (з цыкла «Галасы») 39

З КНІГІ «НОВЫЯ ВЕРШЫ»

Пантэра 40
Арфей. Эўрыдыка. Гермес 40
Паэт 44
У зале 44
Ваза з ружамі 45
Алкестыда 47
Песня кахання 50

З КНІГІ «НОВЫХ ВЕРШАЎ ДРУГАЯ ЧАСТКА»

Леда 51
Заклінанне змей 52

З КНІГІ «РЭКВІЕМ»

Вольфу графу фон Калькройту 53

ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ

Ты гаварыла мне, і смутна... 59
Сутонне — кніга залатая... 60
Баюся людскіх я дакладных слоў... 61
*** Дні, уяўна плывучы ад нас... 62
*** Зноў мы і зноў, хоць і знаем сакрэты кахання... 62
Пачатак кахання 63
*** Той, хто душэўна замоўк... 64
*** Шчасце — ўсвядоміць, што невыказнасць... . 64
На вуліцы, сонцам абжытай... 65
*** Цэлы свет быў у абліччы мілай... 66
Ідал 68
Гонг 69

ДУІНЕНСКІЯ ЭЛЕГІІ

Першая элегія 70
Другая элегія 73
Трэцяя элегія 76
Чацвёртая элегія 78
Пятая элегія 81
Шостая элегія 85
Сёмая элегія 87
Восьмая элегія 90
Дзевятая элегія 92
Дзесятая элегія 96

САНЕТЫ АРФЕЮ

Першая частка

I *** У росце дрэва: чыстае ўзрастанне!.. 101
II *** Нібы дзяўчынка выбегла з мяне... 101

III *** Бог гэта змог. А як жа — чалавек?.. 102
IV *** О пяшчотныя! Хоць вас не кліча... 103
V *** Не стаўце помнікаў... 103
VI *** Можа, тутэйшы ён?.. 104
VII *** Хай жыве слава!.. 104
VIII *** Вольна ў храме славы пераможнай... 105
IX *** Той, хто бярэ ў царства тла... 105
X *** Гонар табе, верны сябар душы... 106
XI *** Глянь: сузор'е Коннік!.. . . . 107
XII *** Слава духу лучнасці!.. . . . 107
XIII *** Слівы, яблыкі, агрэст, маліны... 108
XIV *** Мы росцім кветкі, вінаград, плады... 108
XV *** Смак... Прападае, як зелень садоў! 109
XVI *** Дружа мой, ты адзінокі ўдвайне... 109
XVII *** Старча мой, у глыбіні... . . . 110
XVIII *** Чуеш? — новае, бог... 111
XIX *** Хоць і мяняецца свет... . . . 111
XX *** Чым аддзякаваць, божа, табе за твой дар?.. 112
XXI *** Зноў зазвінела вясна... . . . 112
XXII *** Нам — рух скараецца... . . . 113
XXIII *** О, калі толькі парыў... 113
XXIV *** Ці ж выракацца сяброўства старога нам варта... 114
XXV *** Толькі Цябе я, Цябе, каго кветкаю знаю... 114
XXVI *** Ты, паўнагучны, прыгожы ў суладдзі мелодый... 115

Другая частка

I *** Дыхай на поўныя грудзі, нябачны мой верш... 116
II *** Майстар умелы паглядам акіне... 116
III *** Люстры: што ў сутнасці вашай забыта... 117
IV *** О гэты звер, не бачаны яшчэ! 117
V *** Мускул той, што зранку ў анемоне... 118
VI *** Ружа, царыца красы... 119
VII *** Кветкі, як блізкія вы тым рукам... 119
VIII *** Мала ўжо вас, супольнікаў гульняў дзіцячых... 120
IX *** Не выхваляйцеся, суддзі... . . 120
X *** І дасягненні твае можа разбурыць машына... 121
XI *** Многа стварыла ты, смерць, правілаў... 121
XII *** Змены жадай у сабе... . . . 122
XIII *** Ростань пакінь за сабой... . . 123
XIV *** Бачыш ты кветкі... 123
XV *** Калодзеж і нетраў, жыццядайны рот... 124
XVI *** Зноў і зноў імкнёмся мы да Месяца... 124
XVII *** Дзе і якія, шчаслівай расою акропленыя... 125
XVIII *** О танцорка! О, колькі духу... . 126
XIX *** Золата ў банках жыве... . . . 126
XX *** Зорныя далечы не параўнаць з блізкім... 127
XXI *** Сэрца маё, апявай не знаёмыя мне сады... 127
XXII *** Лёсу насуперак... 128

XXIII *** Пазаві мяне ў трыванні той гадзіны... 128
XXIV *** О стваральнасці шчасце! . . 129
XXV *** Слухай: першая грабляў песня... 129
XXVI *** О, як узрушліва птушка крычыць... 130
XXVII *** Час разбуральны, ці ёсць ён... 131
XXVIII *** Прыйдзі і зноў ідзі... . . . 131
XXIX *** Чуеш, даляў ціхі друг... . . . 132
Заўвагі аўтара 133
Заўвагі перакладчыка 135

Рыльке Р. М.

Р 95 Санеты Арфею: Лірыка. /Выбраў і пер. з ням. мовы В. Сёмуха; — Мн.: Маст. літ., 1982.— 143 с., іл., 4 л. іл.— (Паэзія народаў свету).

У пер. 75 к.

Райнэр Марыя Рыльке — сусветна вядомы аўстрыйскі паэт пачатку XX стагоддзя. На беларускай мове выдаецца ўпершыню.

Р $\frac{4703000000-094}{М 302(05)-82}$ 162—82

ББК 84.4 (Австр.)
И(Австр)

Ілюстрацыі ўзяты з кнігі:
Rilkes Leben und Werk im Bild.
Bearbeitet von Ingeborg Schnack.
Insel-Verlag, Wiesbaden, 1956.

Поэзия народов мира

РАЙНЕР МАРИЯ РИЛЬКЕ

Сонеты Орфею

Лирика

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар Н. І. Тулупава. Афармленне У. М. Якуніна. Мастацкі рэдактар Л. Я. Прагін. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар А. Т. Глушчанка

ІБ № 1318

Здадзена ў набор 08.02.82. Падп. да друку 20.05.82. Фармат 70×90¹/₃₂. Папера афс. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,26+0,29 укл. Ум. друк.-адб. 5,55. Ул.-выд. арк. 5,59. Тыраж 3000 экз. Зак. 2388. Цана 75 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскае вытворчае паліграфічнае аб'яднанне імя Я. Коласа. 220005. Мінск, Чырвоная, 23.